ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Літаратура і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 63 (1700) | Аўторак, 7 жніўня 1962 года | Цана 4 кап

**У ГЭТЫМ НУМАРЫ**

НЯМЕРКНУЧЫ ПОДЗВІГ ПАКАРЫЦЕЛЯЎ КОСМАСУ
РАЗМОВА АБ СУВЕНІРАХ
РЭЦЭНЗІЯ НА СПЕКТАКЛЬ КАЛІНІНГРАДСКАГА ТЭАТРА
СЕЙБІТЫ ЦУДОЎНАГА
НАТАТКІ ПРА АПОВЕСЦІ МАЛАДЫХ
УРЫВАК З РАМАНА А. ЧАРНЫШЭВІЧА
ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

Трактарыст, шафёр, механік, камбайнер — вось колькі прафесій у Леаніда Адамавіча Крыжыка з калгаса «Шлях да камунізма» Клецкага раёна. Пачалося жніво. І ледзь толькі ўзыдзе сонца, агрэгат Леаніда Адамавіча ўжо ў полі.

Камуніст Леанід Адамавіч Крыжык сёлета даў слова ўбраць 250 гектараў збожжа за сезон. Лічба не маленькая. Але чалавек, які ўмее так самаахвярна працаваць, як Крыжык, слоў на вецер не кідае.

Фота П. Наватарава. (БЕЛТА)

# ШТО ПАДАРЫЦЬ НА ЎСПАМІН

К. ПЯЧОНКА, дырэктар Белювеліргандлю.

У Беларусі нямала выдатных прыгожых мясцін, гістарычных помнікаў. Гэта — сівая гісторыя Полацка і Кобрына, месцы, звязаныя з пятроўскімі і суворaўскімі паходамі, гэта — помнікі, дарагія сэрцу кожнага савецкага чалавека: домік 1-га з'езда РСДРП і Брэсцкая цытадэль. Цудоўная і прырода нашага краю, багатая унікальнымі запаведнікамі. У песнях і легендах услаўлены дзівосныя Браслаўскія азёры, Нарач, Нёман — найпрыгажэйшыя, цудоўныя месцы адпачынку. Нездарма ў Беларусь з'язджаецца з кожным годам усё больш і больш турыстаў з усяго Савецкага Саюза і іншых краін. Рэспубліка наша, якая з'яўляецца нібы заходнімі варотамі краіны, сустракае і праводзіць сотні розных замежных дэлегацый, якіх гасцінна запрашае да сябе Савецкі Саюз.

І па старой традыцыі госці, што пабывалі на нашай зямлі, хочуць набыць сабе на памяць які-небудзь сувенір, памятны падарунак. Але кожны раз, калі да нас звяртаюцца з падобнай просьбай, даводзіцца чырванець — прапанаваць у якасці беларускага нацыянальнага сувеніра няма чаго. І наогул цяжка купіць у нас у магазінах проста рэчы беларускага прыкладнога мастацтва — самабытную нацыянальную кераміку, упрыгожанні, тканіны, посуд, цацкі — вырабы мясцовай мастацкай прамысловасці. А ў рэспубліцы ж ёсць і фабрыкі мастацкіх вырабаў, і майстэрні Мастацкага фонду БССР, і шматлікія арцелі, якія маглі б наладзіць вытворчасць недарагіх, цікавых сувеніраў. Ёсць у нас і шматлікія мастацкія саветы, якія маглі б уплываць на якасць прадукцыі такога роду. Я гавару — маглі б, таму што прадукцыя гэтая або зусім не выпускаецца, або якасць яе пакідае жадаць шмат лепшага. Нават такія вялікія прадпрыемствы, як Мінскі фарфора-фаянсавы завод, шклозаводы «Нёман» і імя Дзяржынскага, працягваюць выпускаць надзіва старамодныя і вельмі дарагія, так званыя падарункавыя наборы, распісныя і гранёныя вазы, накшталт сувенірнага бакала «Лявоніха» ці вазы для кветак «Танец». Новыя ж сучасныя прыгожыя вырабы, якія дэманструюцца на выстаўках і атрымліваюць самыя бліскучыя водгукі, у продаж амаль не паступаюць. На нядаўняй выстаўцы-продажы прадукцыі завода «Нёман» у Мінскім універмагу пакупнікі з зайздрасцю хадзілі вакол прыгожых сучасных і недарагіх выставачных экспанатаў, і з задавальненнем раскупілі тыя нямногія ўзоры, якія завод пусціў у продаж у гонар выстаўкі. Прыгожыя рэчы павінны паступаць на прылаўкі рэгулярна, а не ад выпадку да выпадку. Але заводы працягваюць выконваць план за кошт устарэлага аднастайнага асартыменту. Што, напрыклад, прапануе Мінскі фаянсавы завод пакупнікам? Вырабы, яўна разлічаныя на непатрабавальныя густы, накшталт статуэтак «Дзяўчынка з гуссю», «Дзяўчынка з курамі», «Цымбаліст», «Царэўна-лягушка» і г. д. Ці не сорамна прапаноўваць іх гасцям у якасці сувеніраў?

А наладзіць выпуск сувенірнай прадукцыі зусім не складана. Патрэбны толькі выдумка і добры густ, бо з-за сыравіны справа не стане. Тут пойдзе ўсё: адыходы каляровых металаў і пластмасы, дрэва і скура, шкло і гліна... Узяць хоць бы такія неабходныя ўсім рэчы, як раменьчыкі для гадзіннікаў, кашалькі для манет, партманеты і блакноты са скуры. Падобныя вырабы, якія мы атрымліваем з Літвы, маюць прыгожае арнаментальнае афармленне, вельмі своеасаблівыя. Яны заўсёды карыстаюцца вялікім попытам. На выстаўцы ўзораў, арганізаванай філіялам Гандлёвай палаты ў 1961 годзе, дэманстравалася вялікая колькасць выдатных сувеніраў са скуры. Аднак нашы прадпрыемствы не паклапаціліся пераняць добры вопыт.

На арганізавана вытворчасць у рэспубліцы даступных па цане і прыгожых па мастацкаму афармленню вырабаў з металу — упрыгожанняў, брошак, а таксама значкоў, якія заўсёды карыстаюцца вялікім попытам. Праўда, нядаўна ў Мінску пачалі выпускаць значок «Брэсцкая крэпасць», але ён вельмі няўдала афармлены.

Часта турысты, якія наведваюць Мінск, пытаюцца ў нашых гандлёвых павільёнах сувенір-лялечку, апранутую ў беларускае нацыянальнае адзенне, пашытую з тканіны ці вытачаную з дрэва. Такія сувеніры падвешваюць у аўтамашынах. Мы спрабавалі заказаць іх на Брэсцкай фабрыцы цацак, але нам адмовілі. Мінская фабрыка цацак таксама адмовілася пастаўляць гэтыя сувеніры, бо яны недарагія і невыгадныя. У той жа час розныя прадпрыемствы, як, напрыклад, фабрыка «Культпром» выпускаюць так званыя мастацкія вырабы з дрэва — масіўныя, дарагія, безгустоўныя шкатулкі з зубрам, манетніцы з відам плошчы Перамогі, якія не карыстаюцца попытам у пакупнікоў. Тое ж трэба сказаць і пра вырабы брэсцкіх майстроў — інкрустатараў і разьбяроў па дрэву. Шкатулкі іх з інкруставанымі партрэтамі і пейзажамі вельмі вялікія, немастацкія, а галоўнае, вельмі дарагія — ад 30 да 60 рублёў штука. Зразумела, яны занадта працаёмкія для вырабу. Але каму патрэбна, каб на вытворчасць сувенірных рэчаў затрачвалася столькі працы! Сувеніры павінны быць простыя, арыгінальныя, своеасаблівыя, але недарагія.

А чым дрэнныя сувеніры з керамікі? Паглядзіце, якім попытам карыстаюцца керамічныя вырабы грузінскіх, прыбалтыйскіх, армянскіх, гжэльскіх і ўкраінскіх майстроў у салон-магазінах розных гарадоў краіны, у тым ліку і ў Мінску. На жаль, у нас у рэспубліцы з вялікай цяжкасцю асвойваецца вытворчасць керамікі. У запушчаным стане знаходзіцца керамічная майстэрня пры мастацка-афармленчым камбінаце Беларускага мастацкага фонду. Дарэчы, і іншыя майстэрні — эстампа, ткацтва — не пастаўляюць сваёй прадукцыі не толькі ў агульную гандлёвую сетку, але і ў свой уласны салон-магазін. Але ж мастацка-афармленчы камбінат павінен быць своеасаблівым прыкладам, эталонам у вытворчасці мастацкіх вырабаў. Тады б не квітнелі ў нас такія прадпрыемствы, як Мінская фабрыка мастацкіх вырабаў, якая выпускае проста халтуру на патрэбу мяшчанскіх густаў — усялякія штучныя кветкі з паралону і паперы, антымастацкія хусцінкі і вышыўкі. З таго ж паралону можна вырабляць вельмі цікавыя цацкі па прыкладу тых, што былі прадстаўлены ў адным з апошніх нумароў часопіса «Дэкаратыўнае мастацтва».

Нарэшце, яшчэ пра адзін від сувеніраў нельга не сказаць — гэта пра маленькія кніжачкі-гармонікі і наборы фотапаштовак з пейзажамі і відамі гарадоў рэспублікі, невялікія фотаальбомы, прысвечаныя помнікам старажытнасці, выдатным дзеячам культуры рэспублікі і г. д.

Праўда, падобныя выданні ажыццяўляюцца Беларускім дзяржаўным выдавецтвам, але іх вельмі мала.

Не маючы дастатковага асартыменту сваіх беларускіх сувеніраў, ювеліргандаль вымушан купляць іх за межамі рэспублікі. І трэба сказаць, што не заўсёды ёсць магчымасць купіць лепшае. Побач з высокамастацкімі вырабамі фарфоравага завода імя Ламаносава, а таксама розных мастацкіх прадпрыемстваў Масквы, Ленінграда, Каўнаса, Вільнюса, Рыгі мы часам атрымліваем вельмі няўдалую прадукцыю, як, напрыклад, тыя самыя сушаныя крабы і гіпсавыя статуэткі з Севастопаля і Алушты, пра якія ішла гаворка ў нататцы пад рубрыкаю «Асцярожна, пошласць» у адным з нумароў газеты «Літаратура і мастацтва».

Як жа пранікаюць да нас антымастацкія рэчы? Бяда ў тым, што гандаль не мае кадраў высокакваліфікаваных таваразнаўцаў-мастакоў, якія б уплывалі на адбор прадукцыі. Гэтай справай даводзіцца займацца людзям недастаткова вопытным, якія не маюць мастацкай адукацыі і добрага густу. Так, аднаму з нашых работнікаў на Усесаюзным кірмашы мастацкіх вырабаў здаліся цікавымі рэчы Ялцінскай і Севастопальскай фабрык, і ён іх заказаў у вялікай колькасці. На праверку аказалася, што ў рэспубліку пачалі кантэйнерамі прыбываць безгустоўнасць і пошласць. Але дазвольце запытаць, ці куплялі б мы падобныя вырабы, калі б выпускаліся на месцы лепшыя?

Нам трэба гандляваць. І, магчыма, не заўсёды віна, а хутчэй бяда наша ў тым, што на прылаўкі мы вымушаны выстаўляць маламастацкую, нецікавую прадукцыю.

Мастацкія вырабы, якія прапануюцца пакупнікам, павінны быць не толькі рэчамі ўпрыгожання быту. Яны павінны прапагандаваць мастацтва і фарміраваць эстэтычныя погляды нашых людзей. Думка гэта не новая, пра гэта шмат пішуць і гавораць. І нам, работнікам гандлю, як і работнікам вытворчасці і мастакам рэспублікі, неабходна больш патрабавальна падыходзіць да гэтай праблемы, весці рашучую барацьбу з усялякага роду мяшчанствам, безыдэйнасцю. Трэба спыніць доступ у быт вырабаў маламастацкіх, пошлых. Але адным пажаданнямі тут не абысціся. Патрэбна ўмяшанне кіруючых арганізацый рэспублікі, у тым ліку упраўленняў Саўнаргаса, у практыку вытворчасці мастацкіх вырабаў Беларусі. У свой час Савет Міністраў БССР прыняў рад пастаноў, якія абавязвалі наладзіць у рэспубліцы вытворчасць сувеніраў і высокаякасных мастацкіх вырабаў. Але пастановы гэтыя выконваюцца марудна, таму што неабходна было не толькі выдаваць пастановы, але і стварыць умовы для перабудовы прадпрыемстваў, дзе патрабавалася замена абсталявання, перагляд планавых заданняў, нарэшце, навучанне кадраў, якіх у рэспубліцы яўна не хапае. У кадры ўпіраецца многае. І ў вытворчасці і ў гандлі не хапае кваліфікаваных мастакоў-прыкладнікаў, мастакоў-канструктараў, мастакоў-таваразнаўцаў, якія маглі б задаваць тон. А без людзей, без спецыялістаў з неабходнымі ведамі і добрым густам мы нічога новага не створым. Неабходна, нарэшце, каб у гэтую справу ўключыўся Саюз мастакоў БССР і Мастацкі фонд. У параўнанні з мастакамі іншых рэспублік беларускія мастакі яўна адстаюць у развіцці прыкладнога дэкаратыўнага мастацтва. Яны не прапануюць цікавых узораў для вытворчасці, Мастацкі фонд не наладжвае выставак вырабаў дэкаратыўнага мастацтва, творчасць у гэтай галіне недастаткова заахвочваецца Міністэрствам культуры БССР. Міністэрства выдаткоўвае вялікія сродкі на закупку твораў жывапісу і скульптуры, якія часта потым пыляцца ў запасніках музеяў. У той жа час на развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якое, дарэчы сказаць, заўсёды сябе акупіць, неабходныя асігнаванні не адпускаюцца. Усё гэта і прыводзіць да таго, што ў рэспубліцы ў нас у вельмі дрэнным стане знаходзіцца вытворчасць мастацкіх вырабаў.

Вось і атрымліваецца, што калі вам патрэбна купіць у Беларусі памятны сувенір, дык апроч сушанага краба ў ракушках з надпісам «Прывітанне з Крыма!» гандлёвыя работнікі нічога лепшага вам не прапануюць.

Кастусь ШАВЕЛЬ

## ЖНІВЕНЬ

Зарнят васковую мяцеліцу
Камбайн шпурляе з рукава.
Пад сонцам садавіна спеліцца,
Што жнівень нам нарыхтаваў.
Налівам пахне і антонаўкай —
Іх больш, як лісця, — тут і там.
І бэры — бронзавыя конаўкі —
Галлё да трэску гнуць к платам.

І сад, і веянь гэта хлебная
Вінам захмеляць — ледзь дыхні.
А песня звонкая, бы срэбная,
Плыве, плыве ў далечыні...
Шчэ стомай жніўнай кожны б цешыўся
І дыхаў водарам палёў,
Ды ўжо туман паміж алешынаў
На мураву нячутна лёг.

# ПЯЦЬ ПЯЛЁСТКАЎ ДРУЖБЫ

3 жніўня на Сусветным фестывалі моладзі было днём культуры і мастацтва. Асноўнае месца ў яго праграме займалі нацыянальныя міжнародныя канцэрты, якія карысталіся вялікай папулярнасцю. За першыя шэсць дзён фестывалю каля ста тысяч чалавек пабывала амаль на ста трыццаці васьмі фестывальных спектаклях і канцэртах. Артысты 70 краін выступалі перад дэлегатамі і жыхарамі Хельсінкі. Буйнейшымі падзеямі ў мастацкай праграме сталі спектаклі гастрольнай групы тэатра Бертальда Брэхта і канцэрты артыстаў Пекінскай оперы.

Вялікую цікавасць выклікалі канцэрты «Мелодыі Лацінскай Амерыкі», «Танцы народаў Афрыкі» і міжнародны вечар джаза з удзелам аркестраў ЗША, Польшчы, Чэхаславакіі і Францыі. Вянцом вялікага свята культуры, якое праходзіла на фестывалі, стаў канцэрт выдатных выканаўцаў сучаснасці — ганаровых гасцей форума моладзі, членаў журы мастацкіх конкурсаў.

Аднак, спектаклі і дыскусіі не вычэрпвалі праграму Дня культуры і мастацтва. Працягвалі работу канферэнцыі па праблемах рабочай і сельскай моладзі, у якіх удзельнічалі прадстаўнікі шасцідзесяці краін. Закончыўся калёквіум «Моладзь і мір». На гэтай дыскусіі не было рознагалоссяў. І гвінеец Дзіяла Муста, і прадстаўнік хрысціянскай моладзі ФРГ Вернер Пфарэр, і Махмуд Гафар з Судана, і многія іншыя дэлегаты гаварылі аб неабходнасці ўзмацнення барацьбы за ўсеагульнае раззбраенне і нацыянальную незалежнасць, гаварылі аб адказнасці моладзі за лёс свету.

Удзельнікі семінара, прысвечанага пытанням дэмакратызацыі адукацыі, прынялі камюніке, у якім адзначаецца, што ўсе студэнцкія арганізацыі павінны прыкладаць яшчэ большыя намаганні для абнаўлення прынцыпаў выкладання ў духу дэмакратызацыі і расшырэння доступу моладзі ўсяго свету да багаццяў навукі і культуры. Гэты семінар быў адным з самых папулярных на фестывалі. У дыскусіі выступіла каля 50 прамоўцаў.

Працягваліся сустрэчы дэлегацый. Дэлегацыя Аўстрыі на сваё вясёлае музычнае свята «Вена танцуе, Вена спявае» запрасіла прадстаўнікоў фінскай і савецкай моладзі.

4 жніўня на фестывалі праводзіўся Дзень навукі, прагрэсу і будучыні. Цэнтральнай падзеяй гэтага дня з'явіўся прыезд на фестываль першага касманаўта свету Юрыя Гагарына.

На вялікай Сенацкай плошчы адбыўся мітынг, прысвечаны сустрэчы ўдзельнікаў фестывалю з першым адкрывальнікам космасу.

У гэты ж дзень у перапоўненай зале Міжнароднага студэнцкага клуба адбылася навуковая канферэнцыя аб міжпланетных палётах. У яе рабоце прынялі ўдзел фінскі вучоны Лехці, акадэмік Л. І. Сядоў і Ю. А. Гагарын. У прэсцэнтры фестывалю была наладжана сустрэча Ю. А. Гагарына з журналістамі Фінляндыі і іншых краін. Вечар закончыўся святочным балем моладзі, на якім прысутнічаў савецкі касманаўт.

Падведзены вынікі мастацкіх конкурсаў фестывалю. На фестывальным конкурсе піяністаў маладыя музыканты Савецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі дасягнулі бліскучага поспеху. У напружаным творчым спаборніцтве яны заваявалі ўсе шэсць медаляў. Залатыя медалі прысуджаны Усеваладу Дзямідаву (СССР) і Красіміру Гацеву (Балгарыя). Сярэбраныя медалі заваявалі савецкая піяністка Наташа Дзераноўская і прадстаўнік Кітайскай Народнай Рэспублікі Лі Чы-фанг. Венгр Імрэ Антал і румын Нікола Брындус атрымалі бронзавыя медалі. Сярод пераможцаў Міжнароднага конкурсу класічных спевакоў — савецкія артысты Алена Абразцова, Валерый Малышаў, Святлана Чуйко. Шмат прадстаўнікоў савецкай дэлегацыі і сярод лаўрэатаў іншых мастацкіх конкурсаў.

# У ТОЙ НЕЗАБЫЎНЫ ДЗЕНЬ

6 жніўня 1961 года свет узрушыла вестка аб новай бліскучай перамозе савецкай навукі і тэхнікі. Следам за Юрыем Гагарыным савецкі касманаўт Герман Цітоў вырваўся за межы зямнога прыцягнення. Семнаццаць разоў абляцеў ён у касмічных прасторах нашу планету!

Год мінуў з той пары.

Не змяншаецца народная цікавасць да казачных палётаў мужных савецкіх «нябесных братоў». І ў гадавіну славутага палёту Германа Цітова мы прапануем увазе чытачоў нататкі Уладзіміра Казакова — саратаўскага лётчыка і пісьменніка, якому пашчасціла быць сярод людзей, што сустракалі Цітова пасля спуску на зямлю касмічнага карабля «Усход-2».

Уладзімір КАЗАКОЎ

НАСТРОІЎШЫ радыёпрыёмнік на маскоўскую хвалю, мы пільна прыслухоўваліся да кожнага шамацення ў дынаміку, чакаючы паведамленняў аб набліжэнні касманаўта-2 да роднай зямлі.

У думках мы былі з ім, уяўлялі абставіны, у якіх ён знаходзіцца, хваляваліся і трывожыліся.

Трывожыліся не зважаючы на тое, што ў паспяховым завяршэнні яго палёту была ўпэўнена навука, што палёт абслугоўвалі радары, радыёмаякі і іншыя разумныя машыны, дыханне і пульс фіксавалі чулыя прыборы, і гэтым рытмам жыла Зямля.

...Па часе ён увaходзіць у ніжнія пласты паветра. Зараз ён павінен зменшыць хуткасць карабля больш чым у сто разоў. Калі гэтага не адбудзецца, яго напаткае лёс метэарыта.

Яго, вядома, бачаць апаратары радарных установак. Напружана ўзіраючыся ў экран, яны чакаюць... І вось на экране залацісты ўсплёск. Маленькі, яркі трохкутнік успыхнуў толькі на секунду, але апаратары ўжо дакладваюць:

— Вышыня... Пеленг... Адлегласць...

Яшчэ два ўсплёскі ажывілі экран.

— Вышыня... Пеленг... Адлегласць...

Значыць, касманаўт катапультаваўся з кабіны і робіць пасадку. Лётчыкам не жадаюць шчаслівай дарогі, ім жадаюць удалай пасадкі!

Так, моўчкі стоўпіўшыся ля рэпрадуктара, уяўлялі мы палёт касмічнага карабля-спадарожніка.

Цішыню пакоя парушыў голас начальніка лётнай часці Мікалая Быкава:

— Хутка на верталёт. Палецім сустракаць Германа Сцяпанавіча Цітова, — загадаў ён мне. І дадаў усміхаючыся: — Спяшайся!

Словы — нібы штуршок. Як прыемна дакладна і хутка выканаць гэты загад.

10 гадзін 17 мінут. Загуў рухавік і лопасці вінтоў з посвістам урэзаліся ў паветра. Расце хуткасць, але расце павольна. Шкада, што ў МІ-4 не рэактыўныя рухавікі!

На борце, апроч экіпажа, — першы сакратар Саратаўскага абкома КПСС Аляксей Іванавіч Шыбаеў і карэспандэнты.

У руках у Мікалая Быкава, які сядзеў у правым пілоцкім крэсле, навігацыйная карта. На ёй невялікім чырвоным кружочкам адзначаны раён, у якім павінен прызямліцца касманаўт. Я нават усумніўся, ці здолее Цітоў прызямліцца з такой дакладнасцю? Бо гэты раён у параўнанні з зямным шарыкам — пылінка!

Запытваю «штаб сустрэчы»:

— Удакладніце раён прызямлення.

Нам паведамляюць, што «Усход-2» ужо на Зямлі і даюць каардынаты пасадкі. Хуткага позірку на карту дастаткова, каб пераканацца ў дакладнасці прызямлення — пункт пасадкі касмічнага карабля не выходзіў з чырвонага кружка.

Але пра самаадчуванне касманаўта яшчэ нічога невядома.

У эфіры чуюцца ўсхваляваныя галасы лётчыкаў, што патрулююць зададзеныя квадраты вялікага стэпу. Па Волзе носяцца быстраходныя кацеры.

— Аб'ект не знойдзены...

— Аб'ект не знойдзены... — дакладваюць з самалётаў.

У мікрараёне пасадкі касманаўта шукае наш калега, ваенны верталётчык. Ён паведамляе:

— Раблю пошукі. Аб'екта не бачу.

— Сядзьце ля населенага пункта і спытайце ў людзей, — загадвае «штаб сустрэчы».

Праз некалькі мінут чуецца бадзёры голас верталётчыка.

— Месца прызямлення ўдакладніў. Узлятаю.

Слухаючы гэтыя словы, нам цяжка было ўтрымацца ад перавышэння максімальна-дапушчальнай хуткасці. Я бачыў нецярплівыя твары таварышаў, іх плечы, міжволі нахіленыя наперад, вочы, якія пільна аглядаюць кожную складку мясцовасці. Так хацелася ўбачыць Германа Сцяпанавіча першым! Але дарэмна! Жоўта-зялёны стэп плыў пад верталётам, не паказваючы нам белых плям — пасадачных парашутаў касмічнага карабля.

Мембраны навушнікаў загулі ад голасу верталётчыка:

— Прызямліўся ля аб'екта. Выставіў ахову. Касманаўт здаровы! Яго павёз старшыня калгаса на аўтамашыне ў раённы цэнтр.

«Касманаўт здаровы!» — гэтае паведамленне выклікала радасць экіпажа і нашых пасажыраў. Мне здалося, што ад іх радасці павялічылася вібрацыя верталёта. Касманаўт здаровы!

Мікалай Быкаў перагаварыў з Шыбаевым і зрабіў мне знак рукою. Я зразумеў без слоў: дагнаць машыну, якая павезла касманаўта!

Наўрад ці калі-небудзь аўтамашыны аглядаліся з паветра з такой увагай, як у час гэтага палёту. Грузавая... з аўтапрычэпам... «Масквіч» — фургон... Вунь «Волга!» Але было позна. Старшынёва машына ўжо ў раённым цэнтры.

Прасачыўшы яе шлях, мы селі на пляцоўцы каля будынка райкома партыі.

Калі людзі паспелі даведацца аб прыбыцці Германа Цітова — не ведаю, але да зачыненых дзвярэй памяшкання ўжо не пройдзеш. З цяжкасцю прабраўшыся ў будынак, мы ўвайшлі ў адзін з пакояў.

Герман Сцяпанавіч сядзеў за сталом і піў чай з лімонам. На ім быў лёгкі блакітны камбінезон, расшпілены да пояса і адкінуты з левага на правае плячо. Пад жоўтай шоўкавай кашуляй угадвалася дужае, трэніраванае цела. Тулава абцягваў шырокі плісіраваны пояс на помачах з уманціраванымі ў яго пласцінкамі-датчыкамі.

Адпіўшы некалькі глыткоў, ён спытаў:

— Як я магу пагаварыць з Масквою?

Яму паказалі на тэлефонны апарат. Ён працягнуў руку, нецярпліва зняў трубку і ўстаў. Па падлозе загрукалі цяжкія касмічныя боты.

Сярэдняга росту, з на дзіва прывабным тварам і хітрынкаю ў ясных вачах, ён выглядаў свежым. І гэта больш за ўсё нас здзівіла. Нам уяўлялася, як некалькі мінут назад, увaходзячы ў шчыльныя пласты атмасферы, ён чуў роў тармазных дзюзаў. Яго прыціскала да крэсла, на грудзі нібы навальвалася жалезная пліта, даводзілася выціскаць дыханне. А навокал, з шумам марскога шторму, біліся ў сценкі кабіны вогненыя струмені плазмы, абпякаючы магутны ахоўны экран. Тысячы градусаў абрушваліся на паверхню карабля.

Напэўна заўважыўшы, з якім здзіўленнем мы глядзім на яго, ён зразумеў гэта па-свойму, правёў левай рукою па нявголенай шчацэ, сказаў:

— За суткі ніколі так не абрастаў, — і прыклаў тэлефонную трубку да вуха. — Гаворыць Цітоў. Мне трэба звязацца з Мікітам Сяргеевічам Хрушчовым.

Ён чакаў, пазіраючы ў акно. У пакоі цішыня. Нарэшце, у трубцы пачуўся голас Мікіты Сяргеевіча. Герман Сцяпанавіч і ўсе прысутныя падцягнуліся...

Шмат цёплых слоў было сказана кіраўніком партыі і ўрада герою-касманаўту. Герман адказваў ясна і проста, з усмешкаю.

А мы глядзелі на чалавека, які жыў у космасе. Нармальна жыў у міжпланетнай прасторы, на арбіце Зямлі, як пра гэта марыў Цыялкоўскі. Адарваўшыся ад планеты, літаральна паміж небам і зямлёю, ён працаваў, адпачываў, снедаў, абедаў, вячэраў, спаў. Як пасланец міру, слаў прывітанні народам кантынентаў, над якімі пралятаў. Яго голас быў голасам нашага народа, Камуністычнай партыі, і ён вярнуўся з космасу камуністам.

Пасля размовы з Хрушчовым Герману Сцяпанавічу паднеслі букет ружаў.

— Ад імя працоўных Саратаўскай вобласці, — сказаў Шыбаеў. — Мы ганарымся, што гэты гістарычны палёт закончыўся на волжскай зямлі, і віншуем вас ад душы.

— Вялікае дзякуй! Цудоўныя ружы! — яны абняліся і пацалаваліся. Цітоў павярнуўся да брыгадзіра-палявода, які першы ўбачыў пагаслыя парашуты «Усходу-2». — Дзякую і вам за першую сустрэчу на зямлі. Я вас ніколі не забуду.

— Ну, калі так, Герман Сцяпанавіч, — не разгубіўся ўзрадаваны палявод, — тады падарыце мне вашу фатаграфію!

— На жаль, у мяне зараз няма, але я вам вышлю. Абавязкова вышлю... Дзе мне памыцца? — спытаў ён у прысутных і, паказаўшы рукамі на твар, з усмешкай дадаў: — Змыць касмічны пыл...

Яго павялі да ўмывальніка. Дужыя рукі палівалі прыгаршчамі ваду на лоб і шчокі. Асвяжыўшыся, ён вярнуўся ў пакой.

Сеў за стол спіною да акна і гэта не давала магчымасці фотакарэспандэнтам зрабіць добры здымак. Вялікае не абыходзіцца без смешнага. У тэлерэжысёра Генадзія Ярошкіна ўвесь час капрызіў рэпарцёрскі «конвас». У пакой увайшла дзяўчына з талерачкаю, на якой былі нарэзаны свежыя памідоры. У другой руцэ яна несла шкляную вазу з яблыкамі. У гэты час Герман Сцяпанавіч павярнуўся да акна. На яго твар упала яркае святло. Ярошкін кінуўся заняць зручную пазіцыю для здымання, закрануў талерачку і збіў памідоры на падлогу. Паслізнуўшыся на іх, ён націснуў спуск кінаапарата, але пстрыкнуўшы двойчы, апарат не запрацаваў. Гледзячы на збянтэжаны, успатнелы твар тэлерэжысёра, Герман Сцяпанавіч засмяяўся.

Стварылася шчырая таварыская абстаноўка.

— Крыху праспаў у космасе і не выйшаў своечасова на сувязь з Зямлёю, — сказаў Герман Сцяпанавіч і выняў з кішэні гадзіннік.

Мы думалі, што ўбачым нейкі асаблівы касмічны гадзіннік, але ў пілота быў звычайны гадзіннік «Чайка», прывязаны да кішэні вяровачкаю. Звычайны, зямны і нават не новы. Стрэлкі гэтага гадзінніка адлічвалі секунды вялікага подзвігу. Таксама быў прывязаны і аловак да жоўтага блакнота з залатым ціснennем «Бартавы журнал. Касмічны карабель «Усход-2».

Хтосьці пажартаваў, што ў космасе, маўляў, і галаву трэба прывязваць.

— У стане бязважкасці ў Юрыя паляцеў аловак і ён ніяк не мог злавіць яго, таму свой я прывязаў мацней, — растлумачыў Цітоў.

Размову спыніў тэлефонны званок. Нейкім цудам на провадзе з'явіліся ўкраінцы. Яны слалі свайму земляку гарачыя віншаванні.

— Перадайце кіяўлянам вялікае прывітанне!

А на наша пытанне:

— Вы ўкраінец? — Герман Сцяпанавіч адказаў:

— Жонка ў мяне ўкраінка, так што і я ў нейкай меры іх зямляк.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

...Прарваўшыся да Цітова, яна абняла яго і моцна пацалавала...

Ідзе жніво... гарачая пара ўборкі ўраджаю. Цяпер у полі ўсе — і стары, і малады.

У госці да калгаснікаў, занятых на палявых работах, часта прыязджаюць самадзейныя артысты Уздзенскага раённага Дома культуры. Іх вясёлыя і цікавыя канцэрты—добры адпачынак для хлебаробаў.

На здымку вы бачыце, як у полі выступаюць перад калгаснікамі сельгасарцелі імя Хрушчова ўдзельнікі самадзейнасці Уздзенскага раённага Дома культуры.

Фота **П. НАВАТАРАВА.** (БЕЛТА).

# У ТОЙ НЕЗАБЫЎНЫ ДЗЕНЬ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

Гэта была, вядома, сціпласць. Ён быў земляком не толькі савецкім людзям. У бурнай радасці чорных, жоўтых і белых народаў, у радыёпаведамленнях на ўсіх мовах аб палёце «Усходу-2» адчувалася сапраўды сваяцкая блізкасць усіх людзей Зямлі.

— А як, цяжкавата было ў палёце?

— Было і лёгка, было і цяжка, сярэднага не было, але ў гэтым яшчэ трэба разабрацца.

— Ручное кіраванне караблём напэўна складанае?

—Сістэма кіравання дасканаля і я атрымаў вялікае задавальненне, кіруючы караблём.

Кіраванне караблём-спадарожнікам — гэта ўжо якасна адрозненне ад палёту піянера космасу Юрыя Гагарына. Мы, пілоты Зямлі, добра разумеем, што такое штурвал у надзейных руках. Герман Сцяпанавіч мог адысці ад зямной арбіты і рынуцца да любой зоркі. Каб прагучала каманда з Зямлі—першая траса да Месяца была б пракладзена чалавекам! Ён мог прызямліцца ў любым пункце зямнога шара і мог паляцець у нязведанае, як вольная птушка са звітага тысячагоддзямі гнязда.

Па касманаўта прыляцеў самалёт. У пакой увайшоў урач з суправаджаючымі. Ён старанна агледзеў касманаўта, задаволена развёў рукамі:

— Агляд паказвае норму!

У адчыненыя вокны пакоя даляталі патрабавальныя крыкі прысутных на плошчы людзей.

— Ці-то-ва! Ці-то-ва! — настойліва скандзіравалі сотні галасоў.

Касманаўта папрасілі напісаць некалькі слоў у Кнігу гонару раёна. Герман Сцяпанавіч узяў ручку і крыху разгублена паглядзеў на прысутных.

— Што пісаць?

— Што-небудзь ад душы.

— Ну, гэта можна.

Пяро забегала па паперы. Пілот, які зрабіў семнаццаць кругасветных падарожжаў і так бліска падышоў да арбіт планеты, пакінуў першы гістарычны запіс:

«Перш за ўсё перадаю гарачую падзяку працоўным раёна за шчырую сустрэчу, цеплыню. Жадаю вам вялікіх поспехаў у вашай працы на карысць нашай любімай Радзімы.

Касманаўт Г. Цітоў.

7 жніўня 1961 года».

Па настрої на плошчы было ясна, што Германа Сцяпанавіча будуць качаць. Урач бурчаў і быў катэгарычна супраць. Але людзі хацелі бачыць касманаўта, чуць яго. Яны мелі на гэта права.

У пакоі адбылася невялікая лятучка: як правесці Цітова на трыбуну, каб уберагчы пілота ад празмерна бурных абдымкаў і прывітанняў.

— Няхай выступіць праз акно, з другога паверха, — прапанаваў нехта.

— Паломяць палісаднік і дрэвы каля будынка.

— Зрабіць карэ і правесці на трыбуну.

Так і вырашылі.

Касманаўта акружылі з усіх бакоў і пайшлі па лесвіцы да выхадных дзвярэй. Наперадзе ішоў высокі і дужы грамадзянскі лётчык Анатоль Усачоў.

Апасенні ўрача былі не дарэмныя. Як толькі адчыніліся дзверы, рукі над галовамі людзей ускінуліся, як крылы. Гул авацый скалануў плошчу. Анатоля Усачова, які ішоў уперадзе, пачалі абдымаць, цалаваць, асыпаць кветкамі. Ён крычаў: «Гэта не я! Не я!»—але яго голас патанаў у агульным захапленні.

А калі ўбачылі Германа Сцяпанавіча Цітова, пачалося такое, чаго і ўявіць нельга было. Натоўп стаў падобны на хвалі ў штурмавое надвор'е. Ланцуг, што ахоўваў праход да трыбуны, ледзь стрымліваў напор. Але ў адным месцы дзяўчына ў белай касынцы ўсім цяжарам цела павісла паміж мужчынамі і расшчапіла іх рукі. Прарваўшыся да Цітова, яна абняла яго і моцна пацалавала. Радасная, расчырванелая, нехаця адышла ў бок. Пажылая жанчына паклала руку на яе плячо і, молада пабліскваючы вачыма, усклікнула:

— Вось шчаслівая!

Трыбуна патанала ў кветках. Герман Сцяпанавіч узняў руку. Але ўзрушанасць, якая ахапіла народ, не праходзіла. Хоць дрэнна чуваць словы, ды радасна бачыць героя.

Скончыўшы гаварыць, касманаўт спусціўся ўніз, на хаду адказваючы на прывітанні і віншаванні, сеў у машыну, каб ехаць на аэрадром.

— На рукі! Данясём на руках! — пачуўся гучны бас.

Дужыя рукі падхапілі машыну. Ля задняга крыла трапятала белая касынка шчаслівай дзяўчыны. Даволі доўгі час колы не краналіся зямлі.

Мы заспяшаліся да верталёта, каб пераляцець на аэрадром.

На лётным полі народу было не менш, чым на плошчы. Калі Герман Сцяпанавіч падняўся па трапу ў самалёт, людзі палезлі на крылы, зазіралі ў бартавыя ілюмінатары. Давялося папрасіць:

— Не хвалюйцеся! Герман Сцяпанавіч выступіць.

Касманаўт зноў паказаўся ў дзвярах кабіны. Яго сустрэў шквал апладысментаў.

— Што мне казаць і не ведаю, — шырока ўсміхаючыся, пачаў Цітоў. — Аб палёце вам усё па радыё вядома... Палёт прайшоў добра. Адчуванне выдатнае. Дзякую вам за сардэчную сустрэчу. Бывайце, саратаўскія сябры! Дзякуй за цёплы прыём. Час на адпачынак.

Касманаўт развітальна узняў руку, вярнуўся ў кабіну самалёта і лёг адпачываць на падвесны ложак.

Самалёт «ІЛ-14» з бартавым нумарам 26 запусціў рухавікі, разбегся і панёс касманаўта ў неба. Следам за ім стартавалі мы і самалёт з маскоўскімі журналістамі.

У палёце нам у пілоцкую кабіну перадалі бутэльку нарзану, якая, на вялікі жаль, не трапіла Герману Сцяпанавічу. Мікалай Быкаў сарваў металічнае вечка і шыпучы напітак з гарлячка выляцеў крыштальным каскадам пырскаў, ахутаны лёгкім дымком. Мы выпілі за нашага калегу—пілота, які першы ў свеце жыў у космасе і самастойна пілатаваў карабель-спадарожнік над блакітнай Зямлёй.

Матор мерна гуў над прыціхлым стэпам, навяваючы думкі аб небапраходчыках, народжаных Савецкай краінай.

# ФІЛЬМЫ

## пра пакарыцеляў космасу

**6-7 жніўня — гадавіна бяспрыкладнага палёту ў космас савецкага касманаўта Германа Цітова. У гэтыя дні на многіх гарадскіх і сельскіх кінаўстаноўках рэспублікі арганізаван шырокі паказ фільмаў аб палётах нашых касманаўтаў Ю. Гагарына і Г. Цітова, аб іх паездках па краінах свету.**

**З вялікай цікавасцю глядзяцца карціны «Першы рэйс да зораў», «Чалавек вярнуўся з космасу», «Зноў да зораў», «Масква сустракае касманаўта-2», «Прага сустракае Гагарына» і іншыя.**

**Хвалюючую каляровую кінакарціну «У 35-ты раз праз экватар» выпусціла да знамянальнай даты на экраны рэспублікі кінастудыя «Маснавукфільм».**

**Фільм грунтуецца на дакументальных здымках паездкі савецкага касманаўта Г. Цітова ў Інданезію, Бірму, Дэмакратычную Рэспубліку В'етнам. У карціну ўключаны здымкі, зробленыя ў час паездкі самім Германам Цітовым.**

**На Ленінградскай студыі навукова-папулярных фільмаў рэжысёрам В. Мельнікавым і сцэнарыстамі В. Травінскім і М. Хейфіцам створана кароткаметражная гістарычна-публіцыстычная кінакарціна «Мікалай Кібальчыч». Яна прысвечана лёсу выдатнага рускага вынаходцы і рэвалюцыянера-народавольца М. Кібальчыча. У 1881 годзе, пасля забойства Аляксандра II, Кібальчыч, які асабіста ажыццяўляў увесь тэхнічны бок замаху, быў схоплены і пасаджаны ў турму. Там за некалькі дзён да пакарання смерцю, ён распрацаваў праект выкарыстання ракеты для палёту ў космас. Нашы сучасныя ракеты працуюць па прынцыпу тых, пра якія пісаў Кібальчыч. Ён быў першым у свеце чалавекам, які заклаў асновы сучаснай касманаўтыкі.**

**Р. ЗАЙЦАЎ.**



**СПЕКТАКЛІ НАШЫХ ГАСЦЕЙ**

# І Ў ПЕКЛЕ ПЕСНЮ НЕ СПАЛІЦЬ

**Георгій КОЛАС**

Арфей быў сынам рачнога бога Эагра і музы Каліёпы. Ён жыў у далёкай Фракіі. А Вэл Ксав'е жыў у адным са штатаў Амерыкі. Хто былі яго бацька і маці, невядома. Вядома адно: ён, як і Арфей, вельмі любіў спяваць і спяваў так, што, здавалася, сілы Аіда зачараваліся б яго мелодыямі. У Арфея была старажытная кіфара. У Вэла — звычайная гітара. Ды не, не звычайная. На ёй пакінулі свае імёны выдатныя музыкі і спевакі.

Арфей апынуўся ў царстве Аіда ў пошуках сваёй цудоўнай Эўрыдзікі. А Вэл проста шукаў работу, шукаў сумленнага жыцця. А знайшоў Лэдзі Торэнс. Калісьці яе, дачку прыезджага італьянца, які быў забіты за парушэнне расісцкіх законаў, купіў уладальнік магазіна Джэйб Торэнс. Ёй нічога не заставалася, як прадаць сябе: напярэдадні смерці бацькі малады, прыгожы прамыслоўца зганьбіў яе маладосць і кінуў дзяўчынку ў цяжкім стане. З ёю здарылася тое самае, што з Эўрыдзікай: атрута змяі спыніла яе жыццё.

Лэдзі жыла, нібы цень у царстве Торэнсаў і Кетрыраў. І вось з'явіўся Вэл. Лэдзі яго пакахала. І ён яе пакахаў. Яна ўжо амаль ажыла, перастала быць ценем. Ім трэба было уцячы за граніцу гэтага штата, як уцяклі Арфей з Эўрыдзікай праз змрочныя воды свяшчэннай ракі Сцікса. Уцякаць без аглядкі. Але яны азірнуліся. І загінулі. Першай загінула Лэдзі. А потым загінуў і Вэл пад ванканалію раз'юшаных, крыважэрных дэфераў, што стаяць на ахове законаў гэтага штата.

Так выглядае сучасная варыяцыя старажытнага грэчаскага міфа ў драме Тэнесі Уільямса «Арфей спускаецца ў пекла». І гэта — не міф. Сапраўды, хіба можа парадыцца міфічны цар Аід з шэрыфам Толбатам! Уладар падзямелля ўсё ж адчуваў прыгажосць залатой кіфары Арфея — ён аддаў Эўрыдзіку. Для Толбата ж не існуе ні паэзіі, ні прыгажосці. Цені, якія жывуць у яго пекле — сталіцы штата, таксама не падобны да міфічных. За брэхам сабак, за лязгатам паравоза, свісткамі паліцэйскіх не пачуеш іх стогнаў, падобных да шолаху ліся, што спадае ў лесе позняй восенню. Не, тут няма ідылічнасці апавядання, якое дайшло да нас па паэме Авідзія «Метамарфозы». Тут «людзі дзеляцца на тых, хто прадае сябе, і тых, хто іх купляе — таксама як свіныя тушы ў мясной краме».

«Арфей спускаецца ў пекла» — вельмі разумная, тонкая п'еса, пабудаваная на рэзкіх кантрастах тэм — нізасці і пазітычнасці, волі і змрочнага прыгнёту, узлёту пачуццяў і бруду антычалавечых законаў.

Спектакль, паказаны ў Мінску Калінінградскім абласным драматычным тэатрам, нельга лічыць дасканалым. І ўсё ж у ім захавана гэтае перапляценне тэм. Ён гучыць пафасна і лірычна, то з гнеўным сарказмам, то з роздумам, — глядач непаслабна і з хваляваннем сочыць за лёсам герояў.

...Лэдзі Торэнс — артыстка Р. Міхайлава. Яе з'яўленню на сцэне папярэднічае расказ суседкі Б'юлы пра тое, як апынулася Лэдзі ў доме Джэйба. Шчыра кажучы, першае наша знаёмства з самой гераіняй было не ў карысць выканаўцы. Дэманстратыўная рэзкасць, калючасць, парывістасць і экзальтацыя —усе гэтыя рысы, хоць яны і прадугледжаны аўтарскай характарыстыкай, але, як нам здаецца, перабольшаны артысткай у самым пачатку. «Набраныя курсівам», яны будуць замінаць нам і ў першым дуэце з Вэлам. Нават першыя лірычныя ноты там, дзе павінна адчуцца пяшчота, нібыта беспрычынная і незразумелая яшчэ самой Лэдзі, — выканаўца афарбоўвае нейкімі злоснымі інтанацыямі. Гэта непажадана. Стварэцца ўражанне, што гераіню хвалююць «выдатныя фізічныя дадзеныя» Вэла і што яна злуе на сябе за гэта, але ж не можа з сабой саўладаць і пакідае яго ў сваёй краме. У аўтара ж усё гэта вырашана інакш. Лэдзі ўражана незвычайнасцю, дзіваватасцю хлопца, які непадобны да ўсіх, каго яна прывыкла сустракаць у сваім горадзе. Яе ўсхвалявалі яго на дзіва прыгожыя фантасмагорыі — «сабачая» тэмпература, казка пра птушку, якая ўсё жыццё правадзіць у чыстым небе, і кранаецца бруднай зямлі толькі аднойчы — калі памірае. Так, ён спадабаўся ёй, і яна не хавае гэтага. Аднак папярэджвае: у нас будуць добрыя дзелавыя адносіны, а калі вы хоць на хвілінку на іх забудзецеся — нічога, акрамя непрыемнасцей, не выйдзе. Толькі такая шчырасць у спалучэнні з цвярозасцю можа выклікаць словы Вэла: «Ведаеце, што я вам скажу, Лэдзі? Вы на дзіва душэўны чалавек. Я шмат людзей на сваім вяку перабачыў, а такой душэўнай, як вы, яшчэ ні разу не сустрэў».

Аднак далей-болей мы пачынаем згаджацца з узмоцненай напружанасцю, якую надае артыстка духоўнаму жыццю сваёй гераіні. Гатаму спрыяе тая акалічнасць, што першая ж сцэна другога акта па свайму характару супадае з ладам, на які загадзя настроілася выканаўца. Тут — падсвядомая рэўнасць. Далей — выклік ханжаству Б'юлы і Долі, якія асуджаюць «непрыстойны» пратэст паўстаўшай супраць пачварнай маралі Кэрал. Потым — сцэна з Дэвідам, тым самым Дэвідам, чыё дзіця Лэдзі вымушана была вырваць са свайго чэрава... Тут , у гэтай карціне, мы ўжо адчулі і іншыя, свежыя ноты: Лэдзі — Р. Міхайлава летуценна слухала гісторыю Вэла пра тое, як ён калісьці на возеры сустрэў дзяўчыну і як яму здалося, што яна, ружавата-белая, з жамчужным адлівам, і ёсць той адказ на жыццё, якога ён чакаў і шукаў.

— Адказ — каханне? — пытае Лэдзі.

— Так, каханне, — таварыць Вэл. — Іржывы адказ. І нас з вамі зноў ўвяло ў зман, і тысячу гэткіх жа дурняў.

Сум, спачуванне, мары, — усё гэта лунае над імі.

А потым — новы ўсплёск, бурлівы, напружаны, поўны супярэчлівых пачуццяў, — калі Лэдзі канчаткова адчула, што для яе Вэл — адзіны адказ. Яна просіць Вэла з гасцініцы перайсці сюды, у гэты дом, дзе яшчэ дажывае апошнія дні яе ўладар, стары дэспатычны муж. Вэл не згаджаецца («каханне— Іржывы адказ»). Сваім з'едлівым рогатам ён раніць яе пакутлівае сэрца. Яна патрабуе і моліць, пераконнае, кідаецца ў роспачы: «Вы мне патрэбны, каб я магла жыць...» І якой чысцінёй, якой уладарнай сілай высокіх пачуццяў поўніцца сцэна, калі яе рука паціху і ўрачыста зацягнае фіранку. У вачах Лэдзі — шчасце. Здаецца, гэта яно потым будзе ліцца святлом праз фіранку ў залу разам з мелодыяй песні Арфея — Вэла.

Трэці акт — і кульмінацыя, і развязка. Адзін за другім падаюць удары на сучасных Арфея і Эўрыдзіку, Джэйб, што стаіць ужо адной нагой у труне, жорстка адпомсціў Лэдзі: ён прызнаўся, што гэта ён, яе муж, калісьці забіў яе бацьку. Шэрыф даведаўся аб падазроным мінулым Вэла і загадаў да раніцы пакінуць горад, інакш — смерць. Нарэшце, да Лэдзі прыходзіць яшчэ навіна: яна павінна стаць маці.

Здавалася, што артыстка не здолее на поўную моц перадаць новы (і не адзіні) эмацыянальны ўзлёт. Здавалася, ёю выкарыстаны ўжо найвышэйшыя ноты. Але мы памыліліся. Іменна тут, у трэцім акце, пачуцці яе дасягнулі апагея. Страх і разгубленасць перад мужам, затым аняменне — Лэдзі нібы здранцвела, убачыўшы забойцу бацькі. Праз хвіліну — непахісная прага помсты. І раптам новы ўдар — ад'езд Вэла. Пякельны боль, адчайная барацьба і... высокае, свяшчэннае супакаенне.

Не, усё ж «Арфей» павінен быць падобны да Арфея. Бо завошта ж тады з такой лютасцю рвуць яго на кавалкі змрочныя жыхары пекла? Пэўна, не толькі за «ўласнасць» Торэнса. Ён— зусім іншы чалавек, не такі абыякавы, як яны. Ён — з ідэаламі, і яго ідэал — Лэдзі!

Цікавы трагікамічны вобраз намечаны заслужанай артысткай РСФСР Н. Андрыеўскай (Ві Толбат). Яна— увасабленне тых душ, што жывуць нібы цені ў царстве яе мужа, шэрыфа Толбата (засл. арт. РСФСР К. Друтман).

І яшчэ аб адной, амаль бясспрэчнай, творчай удачы ў спектаклі хочацца сказаць у заключэнне. Гэта — Кэрал Катрыр у выкананні заслужанай артысткі РСФСР Т. Крыман. Артыстка ўвасобіла ў жывым, вельмі складаным характары сваёй гераіні яскравы, хоць і бяссільны пратэст супраць нораваў пекла. Гэта «згублены чалавек». Уладары, нават родзічы выгналі яе са свайго штата. І вось яна лунае па свеце, часам урываецца зноў сюды, каб эпаціраваць абывацеляў, каб дражніць сваім выглядам гаспадароў. Артыстка пранікнёна раскрывае лірычную тэму вобраза. Надзвычайнае ўражанне пакідае яна ў фінале. Ёй дасталася гітара і куртка Вэла. Нешта новае, незнаёмае адбываецца ў душы гэтай падсвядомай пратэстанткі. Здаецца, нібыта мы чуем заканчэнне міфа пра Арфея:

«О, цуд! — струны кіфары, якую адносяць хвалі ракі, ціха гучаць, нібыта скардзяцца на пагібель песняра, а ім адгукаецца сумна берат. Уся прырода аплаквала Арфея: плакалі дрэвы і кветкі, плакалі звяры і птушкі, і нават нямыя скалы плакалі, а рэкі сталі мнагаводней ад слёз, якія пралівалі яны... Усё далей і далей адносіў Гебр галаву і кіфару песняра да шырокага мора, а марскія хвалі прынеслі кіфару да берагоў Лесбаса. З тых часоў гучаць гукі дзіўных песень на Лесбасе. Залатую ж кіфару Арфея бацькі змясцілі потым на небе сярод сузор'яў».

Пойдзе адсюль Кэрал. Яна будзе імчаць па шырокіх дарогах. А ў вышыні ёй будзе свяціць сузор'е Ліры. І ў ім—зорка першай велічыні—Вега. Кэрал будзе спыняцца і моўчкі глядзець у сузор'е, угадваючы ў ім кіфару сучаснага Арфея.

Гэта добра, калі тэатр ставіць п'есы, якія і нас, гледачоў, нашы погляды скіроўваюць туды — на сузор'і.

**Ненальні сваіх работ паказаў ужо мінскаму гледачу Калінінградскі тэатр. Сярод іх — спектакль «Небяспечней за ворага», сцэну з якога мы публікуем. У ролях: Дапятроўскага — заслужаны артыст РСФСР Н. Сямёнаў, Галіны Фёдараўны — артыстка І. Фадзеева.**

**Фота Ул. КРУКА.**

# НА АДНЫМ ЗАВОДЗЕ

### ЦІКАВЫ ВЕЧАР

Рабочыя «Гомсельмаша» тт. Волкаў, Чэкан, Хатулёў, Вераб'ёва папрасілі адказаць на пытанне: «Што такое рэлігія?». У Палацы культуры завода пераліся і вырашылі арганізаваць спецыяльны вечар, прысвечаны антырэлігійнай тэме.

Адказаць рабочым запрасілі кандыдата філасофскіх навук А. Краснову. Яна падрабязна спынілася на тым, як узнікла развівалася, каму служыць рэлігія, якую шкоду яна прыносіць. У прэзідыум паступіла яшчэ дзевятнаццаць пытанняў. Рабочыя атрымалі на іх змястоўныя адказы. Цікавы быў гэта вечар у заводскім Палацы культуры.

### ВЫСТАЎКА, ПРЫСВЕЧАНАЯ БРАТНЯЙ КРАІНЕ

На дзесяці вялікіх стэндах размясцілі на заводзе фотавыстаўку, прысвечаную Кітайскай Народнай Рэспубліцы. На выстаўцы пабывала ўжо шмат наведвальнікаў. Асаблівую цікавасць выклікае ў гамяльчан стэнд аб жыцці працаўнікоў Цяньцзыньскага дывановага камбіната.

### КАРЦІНЫ САМАДЗЕЙНАГА МАСТАКА

Наладчыка Івана Міхайлавіча Міхайлава на «Гомсельмашы» ведаюць як добрасумленнага працаўніка, перадавіка вытворчасці. Але Іван Міхайлавіч яшчэ і здольны самадзейны мастак. Многім падабаюцца яго пейзажы «Дарога ў лесе», «Сакавіцкае сонца», «Від на парк». Любімай справе Міхайлаў аддае ўвесь свой вольны час. Ён ніколі не адмовіцца аформіць чырвоны куток, дасць параду, як лепш размясціць наглядную агітацыю. У Міхайлава ёсць задума стварыць галерэю партрэтаў — ударнікаў камуністычнай працы.

### ЧАЦВЁРТЫ Ў ГОРАДЗЕ

Добры падарунак атрымалі рабочыя завода «Гомсельмаш»: тут адкрыўся шырокаэкранны кінатэатр. Гэта чацвёрты шырокаэкранны кінатэатр у горадзе. У першы ж дзень сеансы наведала больш 1.300 гледачоў.

**І. ЗВЯГІН.**

# СЕЙБІТЫ

**А. КОГАН,**

**член прэзідыума Віцебскага абласнога аддзялення Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў.**

Больш чатырох год назад на вуліцах Віцебска з'явіліся афішы, якія паведамлялі аб тым, што 12 сакавіка 1958 года пачынае працаваць універсітэт культуры, арганізатар якога — абласное аддзяленне Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў. Думку аб стварэнні універсітэта падала група работніц фабрыкі «КІМ», якія ў час адной з лекцый-канцэртаў звярнуліся да лектара з просьбай памагчы ім навучыцца больш глыбока разумець літаратуру і мастацтва.

Быў створан двухгадовы універсітэт культуры. Цікавасць да яго была вялізарная. Праз некаторы час такіх універсітэтаў у вобласці стала ўжо некалькі дзесяткаў. Аднак далёка не ўсе яны адпавядалі свайму прызначэнню. Справа стала модная і некаторыя кіраўнікі ўстаноў культуры пачалі называць звычайны лекторый універсітэтам.

Цяпер у Віцебскай вобласці больш трох дзесяткаў універсітэтаў, але каля дваццаці з іх цяжка нават назваць лекторыямі. Семінарскія заняткі, дыспуты, вечары пытанняў і адказаў, віктарыны — вось, што не стала стрыжнем у рабоце такіх «універсітэтаў». Колькі ж можна саміх сябе ашукваць?

Лепш за ўсё універсітэты культуры адкрываць там, дзе для гэтага ёсць магчымасці, а дзе іх няма, арганізоўваць лекторыі культуры, чытаць лекцыі па пытаннях літаратуры і мастацтва.

Асноўная ўмова для адкрыцця універсітэта культуры—наяўнасць кваліфікаваных лектараў. У нашай вобласці іх нямала. Але вельмі часта лектары, спасылаючыся на перагрузку па асноўнай рабоце, адмаўляюцца ездзіць у раёны. Таму вырашылі пасылаць у раённыя універсітэты творчых работнікаў Тэатра імя Якуба Коласа, факультэта чарчэння і малявання педінстытута, мастацкіх майстэрняў, Дома народнай творчасці, музычнага вучылішча, Палаца культуры ўпраўлення прамысловасці і тэлестудыі. Цяпер сілы творчай інтэлігенцыі вобласці размяркоўваюцца больш поўна і раўнамерна. І, як правіла, лекцыі чытаюцца бясплатна. Думаецца, што да некаторых універсітэтаў павінны быць прымацаваны і творчыя арганізацыі Мінска.

Большасць заняткаў у раённых і сельскіх народных універсітэтах праводзяць лектары, якія там жа жывуць і працуюць. Многія з іх, асабліва ў Глыбоцкім, Пастаўскім раёнах, на працягу некалькіх год чытаюць лекцыі працоўным сваіх раёнаў. Але ім трэба памагаць. Таму мы штогод арганізуем семінары лектараў універсітэтаў культуры. На семінарах выступаюць лепшыя спецыялісты з Масквы і Мінска.

Заўважым, дарэчы, што Міністэрства культуры БССР і праўленне рэспубліканскага Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў ні разу не сабралі на семінар лектараў народных універсітэтаў. Хацелася б, каб часцей з лекцыямі выступалі пісьменнікі, мастакі, кампазітары рэспублікі.

Сцяпан Паўлавіч Цітоў, бацька касманаўта Германа Цітова, у сваім артыкуле «Сакрэты душы чалавечай» пісаў, што мімоза, ля якой выконваўся музычны твор, дасягнула вышыні ў паўтара разы большай, чым кветка, якая расла сама сабою, не адчуваючы на сабе плённага ўплыву музыкі. А якія выдатныя ўсходы даюць зерні эстэтычнай радасці, беражліва пасеяныя ў душы добрым музыкантам, артыстам, мастакам! Не думаю, што гэтыя рэчы невядомы нашым дзеячам культуры. Але, на жаль, не ўсе яны хочуць быць садоўнікамі, што сеюць зерні цудоўнага на ўдзячную глебу, якой з'яўляецца аўдыторыя слухачоў народных універсітэтаў.

Змест работы універсітэтаў вызначаецца вучэбным планам і праграмамі. Нядаўна яны выдаданы Усесаюзным Таварыствам па распаўсюджванню ведаў. Праграмы зусім правільна арыентуюць на неабходнасць глыбокага вывучэння літаратуры ці аднаго з відаў мастацтва. Бо часам ва універсітэтах культуры чытаюцца выпадковыя лекцыі: аб літаратуры, аб тэатры. Слухачы гаварылі «аб усім і ні аб чым».

Праўда, праграмы не пазбаўлены недахопаў. Мы не можам згадзіцца, скажам, з тым, што на вывучэнне зарубежнай музыкі ў іх адводзіцца 44 гадзіны, а савецкай — 34. Толькі называюцца тэмы семінарскіх заняткаў. А вось плана іх правядзення, метадычных указан-

# ПРА СЯБРОЎ І РАВЕСНІКАЎ

М. ГІЛЕВІЧ

За апошнія паўтары-два гады ў друку (часопіс «Маладосць») з'явілася каля дзесяці першых аповесцей маладых празаікаў. Мусіць, зусім заканамерна, што маладыя пішуць пра маладых. Літаратурнай моладзі, за плячыма якой толькі крыху больш чвэрткі стагоддзя, блізкія і зразумелыя смелы парыў рамантыкі, палёт думкі, глыбіня пачуццяў і прыгажосць імкненняў сваіх равеснікаў — маладых будаўнікоў камунізма. А. Сабалеўскі ў аповесці «Жылі-былі хлопцы...» піша пра студэнтаў, А. Кейзараў («Нас толькі сямёра») — пра маладых механізатараў-цаліннікаў, Б. Сачанка («Мальвіна») — аб першым каханні, Л. Арабей («Мера часу») — аб станаўленні характару маладога чалавека ў працоўным калектыве і г. д.

Кожны з названых твораў — гэта спроба шчырай, задушэўнай гаворкі маладога аўтара са сваім равеснікам аб месцы ў жыцці, спроба выказаць свае адносіны да жыцця, да працы і да людзей, падзяліцца з чытачом самым патаемным і хвалюючым. Невыпадкова шэраг першых аповесцей маладых празаікаў напісаны ў форме лірычнага дзённіка, а часам нават «споведзі» галоўнага героя твора, як, напрыклад, аповесць А. Сабалеўскага «Жылі-былі хлопцы...» Варта таксама адзначыць пафас пошукаў праўды, пафас сцвярджэння дабра і справядлівасці, якім прасякнуты старонкі аповесцей. Некаторыя аўтары ўмела валодаюць дыялогам, знаходзяць вострыя канфліктныя сітуацыі, намагаюцца паказаць маральны і інтэлектуальны рост героя.

На гэтым шляху маладым празаікам многага яшчэ пакуль нестае. Часам ім не пад сілу яшчэ падняць той ці іншы жыццёвы пласт, у іх творах дае сябе знаць недастатковасць жыццёвага вопыту і абмежаванасць кругагляду. Гэта і перашкаджае гаварыць на поўны голас аб тым, чым жыве і цікавіцца, абураецца і радуецца іх равеснік.

Але звернемся да саміх твораў...

Аповесць Б. Сачанкі «Мальвіна» адкрываецца эпіграфам з М. Багдановіча: «Маладыя гады, маладыя жаданні...» Малады празаік піша важка, пластычна, кожны сказ аповесці спакойны, пругкі, насычаны. Некалькі яркіх малюнкаў — і перад намі жывая карціна цяжкіх пасляваенных гадоў, калі равеснікі пісьменніка, у бясхлебіцы і бацькоўскіх портках, пазнавалі свет, навуку, першыя радасці і нягоды. Чытаючы, чакаеш глыбокай і шчырай гаворкі аб тым, як фармаваўся характар і светапогляд гэтага пакалення, пазбаўленага дзяцінства, як вялікая горыч ваенных і пасляваенных гадоў заўчасна рабіла дарослымі падлеткаў, і як, нягледзячы ні на што, душы юнакоў і дзяўчат заставаліся чыстымі і светлымі, успрымальнымі да ўсяго чалавечага.

На жаль, пасля прачытання першых раздзелаў даводзіцца расчароўвацца. Неяк нечакана Б. Сачанка зводзіць гаворку да банальнага пераказу няўдалага кахання двух галоўных герояў аповесці — Мальвіны і Кастуся.

Кажуць, што нязначнасць задумы цягне за сабой і нязначнасць характараў герояў. І Мальвіна, і Кастусь атрымаліся духоўна беднымі, нецікавымі, статычнымі: сталеюць яны толькі знешне, фізічна, а не растуць духоўна. Пісьменнік абмежаваў жыццё сваіх герояў рамкамі іх інтымных узаемаадносін. Там жа, дзе яны вырываюцца з кола сваіх інтымных перажыванняў, дзе пісьменнік пакідае іх і гаворыць пра іншае (пра сям'ю Хаіма, пра Мальвінінага бацьку і г. д.), — адчуваецца і мастацкая напоўненасць расказу, і праўда жыцця. Адчуваецца і сам Б. Сачанка — пісьменнік здольны, назіральны, з вялікай любоўю і ўвагай да чалавека.

Асабліва шкодзіць маладым празаікам схематызм. Маючы ў асноўным некаторы вопыт у жанры апавядання, маладыя пісьменнікі, апынуўшыся перад неабходнасцю арганізаваць і асэнсаваць значна большы жыццёвы матэрыял, часта не могуць узняцца да паслядоўнага вобразнага мыслення і збіваюцца на спрошчанасць, якая губіць мастацкую задуму. Схематызм сказваецца не толькі на будове твора, а і на вырашэнні жыццёвых канфліктаў, плаціць за сябе бясконцымі пралікамі ў выбары матэрыялу, буйнапланавай падачай другараднага, неістотнага.

Аповесць Д. Гаўрылкіна «Каця» расказвае пра лёс маладой адзінокай жанчыны, збітай з тропу сектай баптыстаў-пяцідзесятнікаў. Твор, згодна задумы аўтара, гэта яшчэ — і, мусіць, больш за ўсё — расказ пра душэўную прыгажосць і багацце нашага сучасніка, які не можа ні на хвіліну заставацца спакойным, калі нехта недзе пакутуе, ніколі не мірыцца з тымі, хто жыве несумленна, не па законах нашай маралі.

Што ж атрымалася ў аўтара? Вобразы аповесці, за выключэннем, бадай, адмоўных — сектанткі Аўдоцці Лямех, прасвітара секты Фёдара Чубка, не ўзняліся да мастацкіх абагульненняў. Малады пісьменнік не здолеў ашчадна распарадзіцца цікавым матэрыялам, пісаў па зададзенай схеме. Схематызм гэты вельмі сказваецца ўжо ў будове твора: **яна** трапляе ў секту, **за яе** змагаюцца сябры і таварышы, **яна** пераконваецца, што кіраўнік секты — хабарнік, злодзей, распуснік, і парывае з фанатыкамі. Чытач, бадай, мог бы дараваць маладому пісьменніку такую традыцыйнасць сюжэта, калі б у рамках яго былі створаны змястоўныя і цікавыя характары. На жаль, як ужо гаварылася, гэтага, менавіта, і бракуе аповесці.

Галоўная гераіня твора Каця — не жывы, з поўным аблічам чалавек, а беспачуццёвая, халодная схема. За кожным яе рухам, кожным учынкам адчуваецца марыянетка, якая выконвае вызначаную ёй аўтарам ролю пакутніцы. Хацела працаваць разам з аднакласнікамі на ферме — апынулся на чыгуначным пераездзе. Калі Аўдоцця забірае яе да сябе на кватэру, Каця пакорліва падпарадкоўваецца, хоць і ведае, што тая баптыстка. Аўдоцця кліча Кацю на сходку ў малітоўны дом — зноў маўклівая згода. І ўсё гэта без роздуму, без душэўнага супраціўлення.

Ну, а Аляксей Пархоменка, інструктар райкома партыі, другі галоўны персанаж твора? Іменна ён павінен быў, па задуме аўтара, несці на сабе асноўную думку аповесці. Аднак гэта таксама нежыццёвы вобраз. Тыя мясціны, дзе гаворка ідзе пра Аляксея, пакідаюць уражанне штучнасці. Аўтар надзяляе яго самай выдатнай характарыстыкай, гаворыць пра яго ўзнёсла, пафасна. Гэта імкненне падружовіць героя яшчэ больш пазбаўляе яго жыццёвай пераканальнасці і натуральнасці.

«Аляксей быў чалавек парывісты, гарачы. А калі загараўся, тады не шкадаваў ні сябе, ні часу, як кажуць, не піў і не еў, а імкнуўся дабіцца свайго...

І дабіваўся...

Пасля арміі Аляксей не мог прадаўжаць вучобу, бо бацькі яго былі даволі пажылыя, не працавалі і памагчы яму не маглі — іх саміх трэба было падтрымліваць. Ён стаў працаваць сакратаром у тэхнікуме. Адначасова заканчваў дзесяты клас. Пасля паступіў ва універсітэт, вучыўся, а вечарамі працаваў. Цяжка было, але свайго дабіваўся...»

Так «падае» нам Аляксея аўтар. А вось як думае герой сам, **уначы, чытаючы брашуру аб рабоце прапагандыстаў**, пасля таго, як даведаўся, што Каця трапіла ў лапы баптыстаў: «Ён, выходзіць, не дарос яшчэ да сапраўднага партыйнага работніка... Адразу не змог ацаніць усяго, што здарылася. За цэлы вечар штунды могуць нарабіць такога, а ён... У свеце ідзе барацьба. Мінулае не хоча знікаць само. З ім трэба змагацца...»

Такім жа ненатуральным застаецца Аляксей і ў асабістым жыцці. Здарылася так таму, што малады празаік актывізуе сваю пазіцыю без увагі да псіхалогіі героя, апускаецца да сумнай дыдактыкі, замест таго, каб паказаць жыццёвыя з'явы і падзеі праз непасрэднае ўспрыняцце іх героем. Адсюль і вынік: жыццёвая праўда не стала ў аповесці праўдай мастацкай.

Лепшае ўражанне пакідае аповесць А. Кейзарава «Нас толькі сямёра». Напісана яна ў форме шчырага лірычнага дзённіка гераіні. Гэта проста некалькі замалёвак з жыцця маленькага калектыву цаліннікаў, расказ пра некалькі дзён іх працы і адпачынку. Трэба аддаць належнае маладому аўтару: гэтыя асобныя сцэнкі жыцця чытаюцца з цікавасцю, яны зроблены з густам, асветлены дасціпным гумарам. Цікава намечаны і некаторыя вобразы аповесці: стройны, прыгожы і далікатны з усімі Жэня Маеўскі, гарэзлівая, можа залішне бесклапотная Марыйка, «душа кампаніі» Слава Васільеў, уразлівы і начытаны Яша Залатароў, «Тоня з мушкай» — ад імя якой вядзецца расказ.

На жаль, і ў аповесці А. Кейзарава шмат недасканалага. Шчырасць і натуральнасць расказу суседнічаюць з надуманасцю і фальшам. Падчас аўтару здраджвае пачуццё меры і жыццёвай праўды і тады ён збіваецца на бабульку-схему. Трэба паказаць цяжкасці цалінных будняў (без іх цаліна не цаліна) — калі ласка. І аўтар прымушае Славу Васільева на хаду рамантаваць плугі, каб сарвацца пад іх нарогі. Асірацелы трактар «на ўсіх парах» шыбуе па стэпе проста да абрывістага берагу возера. Спыняе яго над самай кручай «Тоня з мушкай». Падобныя эпізоды ўспрымаюцца не інакш, як прыкрая даніна традыцыі ў паказе цалінных будняў.

Але зноў-такі галоўны недахоп аповесці ў тым, што аўтар не стварыў яркіх запамінальных вобразаў, не здолеў узняць свайго героя да ўзроўню сапраўднага героя нашага часу — духоўна актыўнага, па-грамадзянску дзейнага, інтэлектуальна багатага. І тут, бадай, сказалася тое, што малады пісьменнік занадта вузка паглядзеў на жыццёвы матэрыял, які лёг у аснову твора.

Выхаванню моладзі прысвечана першая аповесць Лідзіі Арабей «Мера часу». Прываблівае ўжо тое, што пісьменніца паспрабавала вырашыць мастацкімі сродкамі надзённейшыя пытанні часу: выбар маладым чалавекам жыццёвага шляху, станаўленне новага чалавека, роля калектыву ў выхаванні асобы. Мне да спадобы спакойная, шчырая і цёплая манера апавядання пісьменніцы.

Аднак у абмалёўцы вобразаў сучаснікаў няўдача напаткала і Л. Арабей. Галоўная гераіня аповесці Зоя Булат, былая дзесяцікласніца, прыходзіць працаваць у зборачны цэх гадзіннікавага завода. Трапляе яна сюды выпадкова, проста таму, што не паступіла ў інстытут, а нешта ж рабіць трэба. З першага ж дня працы яна скептычна настроена адносна сваёй будучай прафесіі («Усё роўна кожны дзень адно і тое ж, і так усё жыццё»), енчыць перад маці і бацькам, што працаваць сем гадзін немагчыма, не пад сілу. А тут яшчэ няўдалае каханне да Жэнькі, у якога жонка павінна хутка радзіць... Што хвалюе Зою, якія яе ўнутраныя інтарэсы, яе ідэалы? Няўжо толькі тое, каб накупляць сукенак і пашыць добрае паліто? Такой нікчэмнай, няздольнай на штосьці вялікае застаецца Зоя да канца твора.

Не сталі ўвасабленнем нашага маладога сучасніка і вобразы Рэні і Юры. Рэня — перадавая работніца, завочна вучыцца ў інстытуце. Юра — таксама студэнт, будучы мостабудаўнік. Інтэлектуальны ж іх узровень, іх духоўны змест да крыўднага не высокі і не багаты.

Востра адчуваецца гэтая самая прыземленасць і непераканаўчасць вобразаў і ў аповесці А. Сабалеўскага «Жылі-былі хлопцы...».

Узяць, напрыклад, Васіля, ад імя якога вядзецца апавяданне. Тры гады назад ён скончыў інстытут, працаваў у тэатры, а зараз вучыцца на рэжысёрскім факультэце. Ён старэйшы за Віталя — будучага музыканта, за Віктара і Валодзю — будучых акцёраў, з якімі разам жыве ў студэнцкім пакоі. Аўтар выбраў для аповесці форму споведзі галоўнага героя, нешта накшталт дзённіка. Герой, так сказаць, самавыяўляецца, і чытач сочыць за ім не «з боку», а як бы застаецца з ім сам-насам. У такім разе лірычнае «я» набывае асаблівае гучанне толькі тады, калі расказ хвалюе, выклікае роздум над жыццём. Гэта значыць, тады, калі герой — чалавек высокіх грамадзянскіх ідэалаў і глыбокіх пачуццяў, калі яму ёсць у чым «спавядацца».

Герой А. Сабалеўскага на першы погляд вельмі актыўны, яго як быццам не назавеш раўнадушным. Але актыўнасць гэтая праяўляецца выключна ў... каментарыях і разважаннях. На іх, уласна, і пабудавана аповесць. (Можа быць, з гэтай прычыны ў ёй і адсутнічае дынаміка дзеяння).

Што ж і як каменціруе герой твора? На першую палову пытання можна адказаць з упэўненасцю: **усё!** А вось **як?** — мяркуйце самі.

Заспрачаліся аднойчы хлопцы аб тым, што такое шчасце. Цікава? Аўтар жа паведамляе пра гэтую спрэчку так:

«Завадатаем выступае Віктар.

— Эх, быў бы я багаты, а то што цяпер...

... — Не, — раптам **даволі бойка пачынаю я**. — Шчасце зусім не ў багацці. Я жыў і так, што хапала ўсяго... Раскоша хутка стамляе чалавека».

І гэта, як кажуць, на «поўным сур'ёзе»!

Малады празаік імкнуўся зрабіць свайго героя духоўна чыстым, высакародным і актыўным. Васіль абураецца паводзінамі Валодзі, які пачаў даваць «левыя» канцэрты? Але як? Васіль зноў разважае, разважае нудна і доўга, нібы чытае сумную лекцыю:

«Пачалося ў Валодзі ўсё, відаць, з інстытута.

Ён рана прыйшоў у інстытут, калі яму толькі мінула семнаццаць, калі шмат у яго было яшчэ дзіцячага... У інстытуце яму ўсё давалася без асаблівых турбот. Ён быў таленавіты. І моцны, прыемнага тэмбру голас, і рост, і пластычнасць, і добрая дыкцыя, і прыгожы, выразны твар, — усё было за Валодзю.

... Вопытныя педагогі інстытута памаглі яшчэ больш развіць моцны, прыемнага тэмбру Валодзеў голас, выпрацаваць пластыку, навучылі трымацца на сцэне, — зрабілі ўсё, каб выйшаў з яго артыст. А вось, што перш за ўсё не выйшаў з Валодзі чалавек — гэта, мусіць, прагледзелі».

Безумоўна, што такое аголенае рэзанёрства не можа ні ўсхваляваць чытача, ні выклікаць у яго роздум.

Маладым празаікам трэба хутчэй пазбаўляцца павярхоўнай рэгістрацыі знешніх рысаў характараў сваіх герояў, пранікаць у глыбіню характараў. Чытач чакае ад літаратуры героя актыўнага, самастойнага, героя з высокім грамадзянскім пачуццём.

У стварэнні вобраза героя, верагоднага і паўнакроўнага, не можа быць шаблону. Хай у кожнага пісьменніка ён будзе кожны раз непаўторным і прывабным. А гэта магчыма толькі тады, калі пісьменнік пакажа станаўленне характару, калі змены ў характарах і паводзінах героя будуць вынікаць з самой логікі дзеянняў у творы, а не са схемы.

У аповесці А. Сабалеўскага ёсць адзін неістотны эпізод. Васіль з Віталем узбіраюцца на Ленінскія горы. «Нарэшце, канец нашага шляху, — самае высокае месца, куды льга тут дабрацца.

— Вось яна, вышыня.

У мяне аж дух займае. Такая веліч, такая прыгажосць... Я гляджу і гляджу ўдалечыню на ўсё новыя і нязвыклыя абсягі...»

Якраз і хочацца пажадаць маладым аўтарам хутчэй падымацца вось на такую вышыню, адкуль бачны новыя далягляды. І з гэтае вышыні зірнуць на чалавека, на свайго равесніка, заглянуць у яго ўнутраны свет. Толькі тады ён паўстане са старонак твора ва ўсёй сваёй велічы і прыгажосці.

Студэнтка Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі Галіна Галюк даўно пасябравала з песняй. Яна — актыўная ўдзельніца самадзейнасці ў сваім інстытуце. Галіна любіць спяваць беларускія і рускія народныя песні. Высокае майстэрства яе выканання адзначалася на рэспубліканскіх аглядах мастацкай самадзейнасці, у якіх яна неаднаразова прымала ўдзел.

Фота Ул. КРУКА.

# ЦУДОЎНАГА

няў, хоць бы для адных заняткаў, няма. Адсутнічае спіс кінафільмаў да той або іншай тэмы. Праграма прадугледжвае толькі лекцыі і семінары. Між тым, варта было б адвесці час для сустрэч з дзеячамі культуры, дыспутаў, музычных віктарын, экскурсій, канферэнцый чытачоў, праслухоўвання і абмеркавання музычных фільмаў і канцэртаў. Інакш слухачы будуць толькі **наведваць** універсітэт. А яны павінны **актыўна ўдзельнічаць** у яго рабоце. Аналагічныя недахопы маюць і праграмы па іншых відах мастацтва.

Яшчэ адна заўвага датычыць вучэбных планаў. У народных універсітэтах не прадугледжваюцца заняткі, якія спрыялі б выхаванню пачуццяў прыгожага ў жыцці, у быце, памаглі б выкараніць безгустоўнасць. Некаторыя таварышы лічаць ледзь не крамолай, калі ва універсітэтах культуры чытаюцца лекцыі аб культуры адзення, абутку, прычосках, аб інтэр'еры кватэры, доглядзе скуры твару і валасоў, сервіроўцы стала. А дарма! Мы ў Віцебску правялі цыкл вечароў аб культуры нашага быту. На іх заўсёды было поўна людзей, якія выяўлялі вялікую цікавасць.

На вечарах мы будзем паказваць не толькі добрае, але не абмінём і благога. Слухачы ўбачаць фотаздымкі вырабаў, зробленых неахайна, безгустоўна. Няхай паглядзяць аматарскі фільм аб добрай і дрэннай манеры паводзін. Мы надаём вялікае значэнне вечарам, прысвечаным тэме: як мы гаворым.

Хацелася б папрасіць складальнікаў праграм для народных універсітэтаў нашай рэспублікі (якія, дарэчы, празмерна зацягнулі сваю работу), улічыць гэтыя нашы заўвагі.

Поспеху работы універсітэтаў у многім садзейнічаюць добрыя ілюстрацыі. Магчымасці для гэтага ў нас немалыя, але выкарыстоўваюцца яны далёка недастаткова. У нашым горадзе часта гастраліруюць музычныя і вакальныя калектывы краіны. Прыязджаюць яны, як правіла, летам, калі універсітэты не працуюць. Вельмі рэдка праводзяцца таксама сустрэчы артыстаў гэтых калектываў з нашымі слухачамі. У баку ад перыферыйных універсітэтаў стаіць Тэатр оперы і балета. Вельмі рэдка рыхтуюць ілюстрацыі для універсітэтаў калектывы мастацкай самадзейнасці.

У мінулым годзе пры абласным аддзяленні Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў быў створаны сімфанічны аркестр, які падрыхтаваў чатыры канцэртныя праграмы. Далёка не ўсё было добра і з падборам рэпертуару, і з выканаўчым майстэрствам. Але трэба было бачыць, з якім захапленнем і ўвагай слухалі людзі канцэрты аркестра. Мы спадзяёмся, што многія музыканты згодзяцца выступаць на грамадскіх асновах, што вялікую дапамогу ў гэтым акажуць нам Тэатр імя Якуба Коласа, музычнае вучылішча, Палац культуры і абласное ўпраўленне культуры.

Нядаўна ў Віцебску пабываў аркестр Смаленскага музычнага вучылішча, які выканаў у гарадскім Доме культуры класічныя творы рускіх і савецкіх кампазітараў. Лепшыя студэнты нашага музычнага вучылішча могуць падрыхтаваць спецыяльныя праграмы для ілюстрацыі лекцый у народных універсітэтах.

Часцей за ўсё лекцыі суправаджаюцца кінафільмамі. Але іх мала. Многія з фільмаў, што прызначаны для паказу ва універсітэтах культуры, даўно прыйшлі ў нягоднасць або іх зусім няма на базах кінапракату.

Асабліва ў цяжкім становішчы знаходзяцца універсітэты, якія выкарыстоўваюць фільмы на вузкай плёнцы. За апошні час дакументальныя фільмы па пытаннях літаратуры, мастацтва выпускаюцца рэдка.

Народныя універсітэты ахвотна наведваюць тыя, хто хоча навучыцца разумець творы літаратуры і мастацтва. Маладыя, дапытлівыя, яны ўважліва слухаюць кожнае слова лектараў аб музыцы, тэатры, жывапісу. І калі праз некаторы час былы слухач універсітэта наведае тэатральную, канцэртную або выставачную залу, можна будзе ўпэўнена сказаць, што прыйшоў патрабавальны глядач і слухач.

У раёнах да гэтага часу працуюць розныя віды універсітэтаў. Але яны ізаляваныя адзін ад аднаго. Вось чаму, на нашу думку, мэтазгодна ў кожным раёне стварыць адзін універсітэт з рознымі факультэтамі. Факультэтамі ж павінны кіраваць дэканы на грамадскіх асновах.

У народных універсітэтаў — вялікая будучыня. Яны павінны фарміраваць і развіваць высокія маральныя і эстэтычныя якасці ў нашага сучасніка. Ім належыць немалая роля ў выхаванні новага чалавека, чалавека камуністычнага заўтра.

# Светлы, жыццелюбівы талент

Першыя апавяданні Аркадзя Чарнышэвіча, змешчаныя перад вайной у часопісе «Полымя рэвалюцыі», былі заўважаны Кузьмом Чорным. Ды гэта і зразумела. Лепшы сябра і настаўнік літаратурнай моладзі К. Чорны не мог не заўважыць першыя праблескі таго таленту, які потым, пазней, так разгарнуўся і парадаваў беларускага чытача выдатнымі апавяданнямі, аповесцю «На сажалках», раманамі «Світанне» і «Засценак Малінаўка». І сёння гэты талент не супакойваецца на зробленым. Ён — у дзеянні, ён — у дарозе. А дарогу і асільвае той, хто ідзе. Аркадзь Чарнышэвіч плённа працуе над завяршэннем рамана-хронікі «Засценак Малінаўка», над новымі апавяданнямі, выношвае новыя задумы.

Характэрна, што ўсё новае, што з'яўляецца з-пад пяра пісьменніка, сведчыць аб «паступальным руху» яго таленту, аб яго далейшым росце і ўзмужненні. Ды інакш і не можа быць. Сапраўдны пісьменнік заўсёды глядзіць і ідзе ўперад. І кожны новы твор яго — новы рубеж.

Аб чым піша Аркадзь Чарнышэвіч?

Аб тым, што ён добра ведае,— аб жыцці вёскі. Учарашняй і сённяшняй, аднаасобніцкай і калгаснай. У прыватнасці, вялікія палотны пісьменніка, раманы «Світанне» і «Засценак Малінаўка» (яны, дарэчы, добра дапаўняюць адно другое) апавядаюць аб станаўленні новага жыцця ў вёсцы, аб барацьбе маралі новай з мараллю прыватна-ўласніцкай. Барацьба гэтая ў творах А. Чарнышэвіча асэнсаваная, асветлена перспектывай. Гэта сведчыць аб тым, што пільнае вока пісьменніка бачыць яшчэ і «трэцюю рэчаіснасць» вёскі — яе будучыню. Магчыма таму ў яго творах праводзіцца такая выразная грань паміж мінулым і сённяшнім днём, магчыма таму так выразна вызначаны пазіцыі аўтара, яго сімпатыі і антыпатыі.

Усе, хто даследаваў творчасць А. Чарнышэвіча, пагаджаліся на тым, што аўтар «Світання» — вельмі назіральны і ўдумлівы мастак, добры знаўца вясковага побыту, тонкі псіхолаг. Да гэтага мала чаго можна дадаць. Хочацца толькі адзначыць, што проза А. Чарнышэвіча ў лепшых сваіх мясцінах яшчэ і вельмі паэтычная. Жывой паэзіяй павявае ад яго пейзажных замалёвак, з пранікнёнай узнёсласцю можа ён перадаць душэўны стан героя.

У пісьменніка, як мы ведаем, нялёгкі жыццёвы лёс, але ён ні на кроплю не растраціў любоў да простага чалавека, веру ў хараство яго душы, яго жыцця. І хоць сёння мы адзначаем 50-годдзе з дня нараджэння пісьменніка, на дзіва молада і свежа гучаць лепшыя старонкі яго твораў, надзвычай ярка і выразна можа ён перадаць светаадчуванне свайго, нават зусім маладога героя. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова перачытаць хоць бы пачатак апавядання «Трактарысты». «За маладым бярозавым гайком, — чытаем мы, — віднеліся хаты невялічкай вёскі, і Васіль адразу ўявіў шырокую вуліцу, домік на самым канцы і прыгожую дзявочую галоўку ў акне гэтага доміка.

І дзіўна стала Васілю. Зося і на працы не пакідае яго. Вобраз яе ўвесь час стаіць у вачах. Тоненькая дзяўчынка, сінявокая, вясёлая, як жаваранак, яна поўнасцю завалодала Васілёвым сэрцам. Васіль аглядаў палетак, які межаваўся з сенажаццю, яму здавалася, што там, у кустах лазняку, мільгае белая Зосіна хустачка. Васіль быў як зачараваны. Ён мог увесь час думаць пра Зосю, успамінаць усё да драбніц аб сустрэчах з ёю».

Несумненна, што аўтар такіх светлых, жыццярадасных радкоў парадуе яшчэ нас не аднойчы сваімі новымі творамі.

## Прывітанне юбіляру

**У сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Аркадзя Чарнышэвіча прэзідыум Саюза пісьменнікаў БССР накіраваў юбіляру віншаванне, у якім гаворыцца:**

**ДАРАГІ АРКАДЗЬ ЗМІТРАВІЧ!**

**Горача віншуем Вас, нашага таварыша па пяру, таленавітага беларускага празаіка, з 50-годдзем з дня Вашага нараджэння.**

**Вы прыйшлі ў літаратуру ў перадваенныя гады, але асаблівую творчую актыўнасць праявілі ў пасляваенны час. Доўгагадовая настаўніцкая праца ў вёсцы спрыяла Вам у вывучэнні жыцця народа, яго мінулага і сённяшняга. Пачынаючы з 1951 года, паяўляюцца ў друку і выходзяць асобнымі выданнямі Вашы творы — аповесці «У адной сям'і» і «На сажалках», раманы «Світанне» і «Засценак Малінаўка», зборнікі апавяданняў для дзяцей і для дарослых.**

**Ваша творчасць вызначаецца глыбокім веданнем жыцця, гарачай любоўю да радзімы і да людзей, непрымірымасцю да ўсяго адмоўнага, што яшчэ сустракаецца ў нашым жыцці, высокімі мастацкімі якасцямі. Вашы кнігі з'яўляюцца каштоўным укладам у беларускую прозу і заслужана карыстаюцца папулярнасцю сярод шырокіх колаў чытачоў.**

**Ад усяго сэрца жадаем Вам, дарагі Аркадзь Змітравіч, добрага здароўя, доўгіх год жыцця, новых творчых поспехаў на літаратурнай ніве.**

# Спатканне ў садзе

Аркадзь ЧАРНЫШЭВІЧ

**УРЫВАК З ДРУГОЙ ЧАСТКІ РАМАНА «ЗАСЦЕНАК МАЛІНАЎКА».**

Гендарсан ішоў дадому не сваімі нагамі. Ён забыў пра ўсё: пра гера Пфэрдсана, які чакаў яго за сталом, пра дачку Эльзу, якая недзе валочыцца, забыўшы ўсякую прыстойнасць; забыў нават пра снеданне, якое, напэўна, ужо астыла. Цяпер усё гэта здавалася яму вельмі дробным і нікчэмным у параўнанні з тым, што адбылося ў млыне.

Ён адчуваў, што яму падклалі вялікую свінню, але даказаць гэтага не мог. Яго ашукалі рускія мужыкі... Ашукалі, як хлапчука. Машына сапсавалася не сама! Яны знарок сапсавалі яе... Хамы!

Перш за ўсё Гендарсану хацелася зайсці ў млын, вылаяць Гарбатага Яся і даць яму некалькі аплявух. Не дагледзеў, сучы сын, машыны! Але калі ўспомніў зверскія Ясевы вочы, доўгія яго рукі з цяжкімі, як гіры, кулакамі, то гэтае жаданне адразу знікла.

Каля свайго флігеля ён апынуўся нечакана, не помніў, калі да яго падышоў. «Гер Пфэрдсан...» — падумаў ён. Як бы ён быў рады, каб гера Пфэрдсана не было сёння ў яго доме, бо адчуваў, што пасля гэтага выпадку ў яго не хопіць вытрымкі паводзіць сябе так, як належыць паводзіць немцу і гаспадару, у якога і ў сям'і, і ў гаспадарцы ўсё ў парадку.

На ганку ён крыху пастаяў, каб прыйсці ў сябе, супакоіцца, каб не пазнаў гер Пфэрдсан, што ў яго вялікія непрыемнасці. Але, божа мой! Хіба ён не пазнае! Такі разумны чалавек!

Ён адчыніў дзверы, як злачынец, які сам ідзе на пакаранне.

— Што здарылася, Паўль? — запытала яго Інга адразу, калі ён пераступіў парог.

Гендарсан махнуў рукой. Яму хацелася аблаяць жонку. Чаго яна, дурная фрау, лезе не ў свае справы? Што яна разумее? Хіба яна паможа яму сваімі ўздыханнямі і слязьмі!

— Эльза прыйшла, — шапнула яму Інга.

У Гендарсана трохі пасвятлела на душы.

— Дзе яна? — запытаў ён.

— Размаўляе з панам Пфэрдсанам.

— Гут, — сказаў Гендарсан. — Ці даўно яна прыйшла?

— Адразу, як ты пайшоў, Паўль. Гер Пфэрдсан нават хвіліны не сядзеў адзін.

— Гут! — паўтарыў Гендарсан.

— У цябе, мабыць, зноў непрыемнасці, Паўль? Табе трэба добра памыцца, бо ты на сябе не падобны, бедны мой Паўль...

— Так... — адказаў расчулены немец. Хто-хто, а жонка то яго разумее!.. — Так, мая дарагая Інгеборг... Я буду мыцца, а ты налі мне кілішак старкі, бо я не магу ў такім выглядзе паказацца геру Пфэрдсану.

Інга ніколі не пярэчыла мужу і, калі ён, памыўшыся, абцёрся калматым ручніком, падала яму кілішак старкі. Ён выпіў з прагнасцю і падумаў, што пры такім жыцці лёгка зрабіцца п'яніцам, але прыкрая чарната, што засланяла яго думкі, адсунулася некуды ўзад.

— У цябе гатова снеданне? — запытаў ён у жонкі.

— Скора будзе гатова. Я чакала цябе, Паўль...

Ён рашуча накіраваўся ў той пакой, дзе сядзелі гер Пфэрдсан і Эльза.

Зубны ўрач зірнуў на Гендарсана з відавочнай цікаўнасцю, а дачка акінула бацьку такім ледзяным позіркам, што таго ледзь не скаланула, але ён не падаў выгляду, што адчувае сябе няёмка.

— Ну, як вы тут праводзілі час, гер Пфэрдсан? — запытаў ён, як нічога і не было. — Я павінен быў адлучыцца. На маіх плячах вялікая гаспадарка. Усюды патрэбна ўласнае вока.

— Вельмі правільна, гер Гендарсан, — сказаў зубны ўрач. — У вас непрыемнасці. Ваша дачка расказала мне.

Гендарсан адчуў сябе так, нібы яго аблілі халоднай вадой. «Дачка расказала!.. Што яна расказала? Няўжо яна ведае пра ўсё, што адбылося ў млыне? Адкуль яна ведае?» — усе гэтыя меркаванні праскочылі ў галаве аконама за адну хвіліну. Не хапала яшчэ таго, каб гер Пфэрдсан усё ведаў пра яго непрыемнасці і няўдачы. Яна мо расказала і пра тое, як яе бацька ўцякаў з канторы праз акно! І, напэўна ж, доктар здагадаўся, чаму Гендарсан прыязджаў да яго лячыць здаровыя зубы... Нягодніца!.. Не ведае свайго месца, забыла свае абавязкі.

— У мяне няма ніякіх непрыемнасцей, гер Пфэрдсан... Проста ў мяне не хапае механікаў, і таму спыніўся млын. Трэба рамантаваць машыну, а хто гэта зробіць? На ўвесь маёнтак адзін механік, якому я не вельмі веру. Рускія — сапраўдныя дзікуны... Тут нельга знайсці чалавека, якому можна было б даверыцца. Яны не любяць чужаземцаў. Яны не разумеюць, што гэта мы — немцы — нясём ім машынную прамысловасць і цягнем за сабой. Усе яны бунтаўшчыкі і свінні.

— Так, так, — мнагазначна пацвердзіў зубны ўрач. — Той, што прыходзіў па вас сёння, сапраўдная малпа.

— А-а! Гэта Гарбаты Ясь! Але яму можна верыць!

— Тата толькі і верыць такім пачварам, — холадна прамовіла Эльза. — Гэты Гарбаты Ясь да паўсмерці збівае сваю жонку. Гэта звер, а не чалавек, і ён — татаў сябра.

Гендарсан пазелянеў. Праклятая дзеўка! Чаго яна лезе не ў свае справы! І адкуль яна пра ўсё ведае!.. Ён гнеўна зірнуў на дачку:

— Іх усіх трэба збіваць да паўсмерці! У іх няма ўдзячнасці! Іх трэба караць так, як тут калісьці было ў часы прыгону.

Гендарсан распаліўся да таго, што, здаецца, гатовы быў сам узяцца за такое пакаранне. Ён нават уявіў, як біў, бы гэтую свінню Вярбіцкага лазовымі дубцамі. Рукі свярбелі, так хацелася пакараць мярзотніка, асабліва за тое, што ён — немец аконам — назваў рускага хама панам, за тое, што пайшоў з бровара, як пабіты сабака. Але ў гэты момант Эльза ўстала і выйшла з пакоя. Ваяўнічы настрой аконама адразу апаў. Гэтая дзяўчына давядзе яго да вар'яцтва. Няхай бы лепш яна спрачалася, няхай бы абараняла сваіх хамаў! Дык не! Яна ні ў грош ставіць бацьку, не лічыцца з ім. Укалола і пайшла...

Гер Пфэрдсан глядзеў на аконама глыбакадумна і мнагазначна.

— Я разумею вас, гер Гендарсан, — нарэшце вымавіў ён. — Я вас вельмі добра разумею.

— О-о! — ледзь не завыў Гендарсан.— Мне тут цяжка жыць!

— Веру, гер Гендарсан, і рады вам памагчы.

Аконам вылупіў вочы. Чым ён можа яму памагчы?

Гер Пфэрдсан добразычліва ўсміхнуўся.

— Я заўсёды рады памагчы вам, гер Гендарсан. І, здаецца, я вам памагу, наколькі гэта ў маіх сілах.

Гендарсан нічога не разумеў.

— Вам патрэбен добры механік. Добры механік-немец.

— О-о! — сказаў аконам. — Але дзе я вазьму механіка-немца?

Гер Пфэрдсан добразычліва ўсміхнуўся.

— Я вам дам механіка, гер Гендарсан. Добрага механіка-немца!

— О, гер Пфэрдсан! Якое гэта было б шчасце! Але дзе вы возьмеце такога чалавека?

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Чалавек і прырода

# Зялёныя помнікі

Чалавецтва старанна ахоўвае помнікі сваёй гісторыі і культуры. Гістарычныя месцы, творы архітэктуры і скульптуры, старажытныя паселішчы, пісьмёны і фрэскі — расказваюць нам пра слаўнае мінулае. Сярод гэтых помнікаў ёсць асаблівыя —нямыя, але жывыя сведкі даўніх падзей—зялёныя волаты-дрэвы, сучаснікі нашых вялікіх продкаў, гістарычных падзей, гераічных подзвігаў.

Шмат такіх дрэў захавалася ў Маскве і Падмаскоўі — магутныя векавыя сосны ў Ізмайлаве, дубы парку Філі—Кунцава, сівыя дуплянатыя ліпы Няскучнага саду. У Горках, сярод меднаствольных соснаў, расце дуб-волат, амаль аднагодак Масквы, якім часта захапляўся Ул. І. Ленін.

Памятныя дрэвы захаваліся ў многіх месцах Украіны. Існуе некалькі дубоў Шаўчэнкі, Кутузаўская таполя, зялёныя помнікі Пятру I, Суворaву, Багдану Хмяльніцкаму. На адной з вежаў старажытнай Мукачаўскай крэпасці расце «Дрэва-свабоды». Яно было пасаджана ў 1848 годзе вязнямі, якіх вызвалілі войскі Кошута. Паданне гаворыць, што зямлю для пасадкі маладзенькай ліпкі былыя вязні насілі шапкамі на працягу некалькіх дзён. Век гэтага магутнага дрэва падыходзіць к канцу. Навуковыя супрацоўнікі Закарпацкай лясной доследнай станцыі вырошчваюць з насення яго маладыя расліны, каб узнавіць памятнае «Дрэва свабоды».

Шмат легенд і паданняў расказваюць пра патрыярха прыўральскіх лясоў, магутны «Пугачоўскі дуб», які налічвае 300 год. Шэсць чалавек, узяўшыся за рукі, ледзь-ледзь могуць ахапіць яго шурпаты ствол. Мясцовыя людзі сцвярджаюць, быццам у час паходу на Аранбург сялянскі цар Емяльян Пугачоў паставіў у засені гэтага дуба свой шацёр і набіраў там воінаў у сваю армію.

Вялікая колькасць шматвекавых дрэў вядома таксама ў Грузіі, Таджыкістане, Узбекістане, Арменіі, Літве, Латвіі і Эстоніі. Усе яны маюць вялікую навуковую і культурную каштоўнасць.

Беларусь таксама славіцца помнікамі прыроды — шматвекавымі ляснымі гігантамі. Старажытныя волаты-дубы растуць на Палессі. Шырока вядомы цар-дуб, які расце ў Данілевіцкім лясніцтве Лельчыцкага лясгаса. Узрост гэтага помніка прыроды—больш 600 год. Славяцца два вялізарныя дубы ў Галевіцкім лясніцтве Калінкавіцкага лясгаса. Адзін з іх мае вышыню 42 метры і дыяметр звыш двух метраў. Агульны аб'ём драўніны гэтага волата складае 33 кубаметры, г. зн. прыкладна столькі, колькі патрэбна для пабудовы вясковай хаты. Другі дуб мае крыху меншы аб'ём. Гэтым ляснym волатам па 250—300 год.

У Навагрудскім раёне ёсць 200-гадовы дуб, пад якім пісаў свае творы вядомы польскі паэт Адам Міцкевіч. А ў ваколіцах Кобрына ёсць шматвекавы дуб, відавочца часоў Айчыннай вайны 1812 года. Пад гэтым дубам адпачываў і складаў ваенныя дыспазіцыі вялікі рускі палкаводзец, генералісімус А. С. Суворaў. Паўтара стагоддзі мінула з часу тых падзей, а дуб расце, нібы сімвалізуючы веліч мінулых бітваў, услаўляе іх, нагадвае пра іх нашчадкам. Ёсць зялёныя помнікі — сведкі менш даўніх падзей. Так, на беразе Заходняга Буга, недалёка ад вёскі Дубіцы, расце дуб-волат, ля якога адбылася няроўная схватка двух мужных савецкіх пагранічнікаў з перадавымі атрадамі гітлераўскай зграі. Герої загінулі, але жывы помнік-дуб нагадвае пра адвагу патрыётаў, якія стаялі тут насмерць.

Але не толькі дубы-волаты сустракаюцца ў Беларусі. Ёсць у нас шматвекавыя ліпы, сосны, таполі, якія таксама дзівяць сваім узростам, памерамі, веліччу. Вельмі любіў прыроду народны паэт Беларусі Якуб Колас. У Стаўбцоўскім раёне на хутары Смольня растуць ліпы, пасаджаныя паэтам у 1912 годзе.

Багатыя каштоўнымі памятнымі дрэвамі вуліцы і паркі Брэста, сярод якіх—унікальны пірамідальны дуб на бульвары імя А. Міцкевіча. У гарадскім парку Гродна ўзвышаецца вялізарны ясень, вышыня якога 48 метраў, а дыяметр 1,4 метра.

Помнікі прыроды, помнікі раслінага свету адыгрываюць вялікую выхаваўчую ролю. У Польшчы і Чэхаславакіі ўсе яны ўзяты на ўлік і старанна ахоўваюцца. Зарэгістраваны і берагуцца рэдкія расліны, а таксама асобныя дрэвы-волаты ў Літве, Латвіі і Эстоніі, у Грузіі, Узбекістане, на Украіне.

Дрэвы-волаты патрэбна выявіць, узяць на ўлік і строга ахоўваць і ў нас у Беларусі. Піянерскія і камсамольскія арганізацыі, турысты, аматары прыроды павінны заняцца гэтым і дапамагчы ахоўваць прыроду рэспублікі. Гэта вельмі важная справа.

**Г. МАРГАЙЛІК,**
**інжынер-лесавод.**

## ЧАЦВЁРТЫ ВІЗІТ

Калектыў Іванаўскага тэатра музычнай камедыі прызджае ў сталіцу Беларусі чацвёрты раз. Апошнія яго гастролі ў Мінску былі ў 1959 годзе. Сёлета ён пакажа: «Севастопальскі вальс», «Чорны амулет», «Сябры Міленьі», «Вяселле Марыён», «Дзявочае каханне», «Халолка», «Рамэо, мой сусед», «Святлана дзе ты?», «Цырк запальвае агні» і іншыя.

У час гастроляў тэатр працягвае работу над новым рэпертуарам. У Мінску будзе выпушчана прэм'ера спектакля «Эўрыка».

Да прыезду ў Мінск тэатр выступіў у Тамбове, Мічурынску, Калініне, Смаленску. Выступленні гасцей перад мінскімі гледачамі працягнуцца да 26 жніўня, пасля чаго яны ад'язджаюць у Калінінград.

На здымку: сцэна са спектакля «Севастопальскі вальс». У ролях (злева направа). Феадосія — заслужаны артыст РСФСР Ю. Чарноў, цёці Дзіны — заслужаная артыстка РСФСР Л. Адамантава, Фёдара Кузьміча — заслужаны артыст РСФСР Э. Май.

Фота **Ул. КРУКА.**

# ПАТРЭБЕН ГРАМАДСКІ КАНТРОЛЬ

Кожную зіму на рынку ў горадзе Лепелі можна бачыць дзесяткі аўтамашын, гружаных бярозавымі дровамі. Тыя, што прадаюць, маюць на руках дакументы, якія сведчаць, што гэта дровы калгаса і прадаюцца яны з ведама праўлення.

Кожны дзень у лясах праслаўленага партызанскага краю чутны стук сякер. Парубшчыкі таксама маюць на руках дакумент — дазвол старшынь мясцовых калгасаў на вырубкі.

Што ж рабіць? Як змагацца з гэтым?

Цяпер, калі прыняты ўжо спецыяльны закон аб ахове прыроды, мне думаецца, лесаводы, работнікі лясніцтваў павінны гэтак жа адказваць за калгасныя лясы, як і за дзяржаўныя. А старшыні калгасаў і калгаснікі павінны секчы толькі тое, што ім дазволіць лясніцтва. У сувязі з гэтым вартаўнікі лясоў і ў калгасных угоддзях павінны быць ад лясніцтва.

Можна і трэба многа павучыцца ў гэтым сэнсе ў работнікаў Старасельскага лясніцтва Рагачоўскага лясгаса. У лясах абсалютная чысціня, лесапрадукцыя прадаецца ў апрацаваным выглядзе з двара лясніцтва, а не з лесу, дзе ляснік мог бы прадаць хвою-дзве «у цёмную», што яшчэ даволі часта, на жаль, практыкуецца. Аб гэтым пакуль што многа гаворыцца, але меры барацьбы ўсё яшчэ застаюцца нядзейсныя. Напрыклад, у некаторых месцах рашылі пракопваць дарогі, якія ідуць праз лясы. Справа даходзіць да смешнага, а часцей і да сумнага, калі аказваюцца перакопанымі дарогі, па якіх ездзяць да ракі, у Рагачоў і іншыя населеныя пункты. Дарогу перакапаюць, а ніякай аб'явы не павесяць. Добра яшчэ, калі абыдзецца гэта сінякамі і шышкамі для матацыклістаў. А нядоўга і да аварыі. Не, гэта не кантроль.

І далей аб кантролі. Факты паказваюць, што калі абход лесу робіць адзін чалавек, хай работнік лясніцтва, з ім іншы раз можна паладзіць. Загляніце ў любы раённы цэнтр ці вёску. Колькі пастаўлена новых добрых драўляных дамоў. А паглядзіце дакументы, па якіх адпускалася драўніна, дык яе і на палову дома не набярэцца. Астатняя, відаць, украдзена? І так, і не! Нярэдка ў планавай камісіі райвыканкома можна пачуць: «Таварышы дарагія, дайце мне кубаметр ці два, абы ў лес заехаць, а там з лесніком дамовімся». І дамаўляюцца, плацяць за лес, высечаны звыш таго, што было адпушчана, але ўжо не дзяржаве, а лесніку. Мне вельмі не хочацца крыўдзіць лесніковў, сярод якіх нямала добрасумленных працаўнікоў. Але такое бывае і дужа часта! Бывае і так, што не дастаўшы нараду, забудоўшчык едзе ўночы і крадзе лес. Змагаючыся з такімі, леснікі «мініруюць» дарогі, раскідваюць «кошкі» накшталт заслонаўскіх. Вынік яшчэ больш сумны. Летась у нашым раёне на такую «кошку» наехаў камбайн, пакалоў кола і прастаяў цэлы дзень.

Такім чынам і гэта не кантроль. Дык што ж рабіць?

На маю думку, было б лепш, калі б да ўдзелу ў ахове прыроды шырэй прыцягвалі грамадскасць. Трэба стварыць грамадскія кантрольныя пасты, праводзіць грамадскія абходы лясоў разам з леснікамі, аб'езды рэк і г. д. Мясцовая інтэлігенцыя, школьнікі, члены Таварыства паляўнічых і рыбаловаў — усе, хто любіць прыроду, прыняў бы ўдзел у добрай справе. Трэба толькі людзей арганізаваць.

**Л. ВАЛЧКОЎ,**
**настаўнік.**

Рагачоўскі раён.

Не першы год працуе бібліятэкарам З. Каляга, выпускніца бібліятэчнага тэхнікума. Бібліятэка Мамайскага сельскага Дома культуры Глыбоцкага раёна, у якой яна працуе, мае шмат кніг беларускіх пісьменнікаў, перыядычных выданняў. Частыя госці бібліятэкі — рабочыя саўгаса «Азярцы». Вось і цяпер З. Каляга (злева) выдае кнігі рабочым саўгаса А. Садоўскай, Э. Хайноўскаму і М. Гунько.

Фота **С. Чырэшкіна.**

# СПАТКАННЕ Ў САДЗЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).**

— Я вазьму яго з Рыгі, гер Гендарсан. Там у мяне ёсць брат. Не родны, але ўсё-такі брат! Добры механік. Ён працаваў на вялікім заводзе. Але вы не ведаеце, што цяпер робіцца ў Рызе! Там вялікія беспарадкі, гер Гендарсан. Ды не толькі ў Рызе, але і па ўсёй Курляндыі і Ліфляндыі. На заводах забастоўкі, у маёнтках бунты. Гэтыя брудныя латышы, гер Гендарсан, не лепшыя за рускіх. Яны нават яшчэ горшыя! Што там робіцца! Я маю дакладныя весткі... Яны, гэтыя брудныя латышы, паляць нямецкія маёнткі, выганяюць памешчыкаў-немцаў. Былі, нават, выпадкі забойстваў... А ў Рызе яшчэ горш. Мой брат, пра якога я вам казаў, працаваў на вялікім заводзе майстрам, то гэтыя брудныя латышы прымусілі яго кінуць работу. Ён добрасумленна выконваў свае абавязкі, што яны паставілі ўмову перад адміністрацыяй завода, каб яго звольнілі з работы...

Тут гер Пфэрдсан зразумеў, што трохі заблытаўся, але выгляду не падаў.

— Адным словам, гер Гендарсан, вы не маеце ўяўлення аб тым, што там робіцца... Я нядаўна атрымаў ліст ад брата. Ён цяпер без работы. Вам патрэбен такі механік?

— Патрэбен! — закрычаў аконам. — Ён мне патрэбен!

Ён зноў распаліўся і грукнуў кулаком па стале.

— Патрэбен, гер Пфэрдсан! Давайце яго сюды! Я ім пакажу Якава Шэмета! Я іх растапчу, мы іх растопчам, бо я пастаўлю вашага брата старшым механікам. О, гер Пфэрдсан! Вас да мяне паслаў сам бог!

Раптам настрой у аконама зноў пагоршыўся. Ён успомніў пра млын, які стаіць мерцвяком, і сэрца яго ўпала. Кожны дзень прастою каштаваў не капейкі, а рублі, частка якіх належала аконаму. Гарбаты Ясь заўсёды сам сабе ўкрадзе, з ім аконам не думаў дзяліцца.

— Як далёка Рыга, гер Пфэрдсан, — прамовіў ён безнадзейна. — Як далёка Рыга! Каб ваш брат быў ў Слуцку! Няхай бы ён быў нават у Мінску!.. А Рыга...

Зубны ўрач дабрадушна ўсміхнуўся і зірнуў на аконама, як на малога.

— Рыга зусім недалёка, гер Гендарсан. Гэта вам толькі так здаецца, што яна вельмі далёка. Вы, мабыць, ніколі не былі ў Рызе. Калі сёння адбіць тэлеграму, то мой брат будзе тут праз чатыры-пяць дзён.

— Праз чатыры-пяць дзён... — як рэха паўтарыў Гендарсан.

— Хіба гэта многа — чатыры-пяць дзён? Калі ваш млын пастаіць нейкі тыдзень, то хіба гэта вялікая бяда?! Мой брат наладзіць работу ў вашым млыне так, што гэты няшчасны тыдзень не будзе мець ніякага значэння, як быццам яго і не было. Толькі тэлеграму трэба адбіць сёння.

— Мы яе адаб'ём! — бадзёра прамовіў Гендарсан. — Калі вы не супраць, то э-э-э... пасля снедання мы з'ездзім у Старочын.

— Я буду вельмі рады памагчы вам.

— А я вас затрымаю тут на пару дзянькоў. Вы ў мяне пагасцюеце, гер Пфэрдсан! У нас знойдзецца аб чым пагаварыць. Спадзяюся, што гэта не адаб'ецца дрэнна на вашай практыцы.

— О, не! У мяне шырокая і трывалая кліентура, гер Гендарсан! Гэта мяне не хвалюе.

— Як я вам удзячны, гер Пфэрдсан! — расчулена прамовіў аконам.

— Нічога! Мы, немцы, павінны заўсёды падтрымліваць адзін аднаго, памагаць адзін аднаму. Асабліва ў чужой старане.

Не ведаў аконам, што зубны ўрач знарок прыехаў да яго, каб знайсці месца свайму брату — штрэйкбрэхеру і здрадніку, якому не было месца не толькі на рыжскіх заводах, але і ў самой Рызе.

Перад абедам у бровар зайшоў заклапочаны Платон Шабуня. Ў гэты час Павел Квітун сачыў за топкай, а Станіслаў курыў, абапёршыся на варштат, і думаў пра Якава Шэмета. Нарэшце-такі яны будуць разам. Скора сяляне пачнуць прадаваць у бровар бульбу, работы будзе па вушы. Узняць цану на сялянскую бульбу — вось якая задача стаяла перад імі.

Платон быў часты госць у броварны, таму ні Павел, ні Станіслаў спачатку не звярнулі на яго ўвагі.

— Хлопцы, — сказаў Платон. — Вы не ведаеце, што гэта за панок гасцюе ў нашага аконама?

Станіслаў узняў галаву.

— А якая нам справа да аконамавых гасцей, Платон? — запытаў ён.

— Вядома, да яго гасцей нам няма ніякай справы, — адказаў Платон. — Але можа ёсць справа да таго, што сёння аконам са сваім госцем паехалі ў Старочын?

— Вось як!

— І не на сваёй кабыле, а на стаенніку. Мы з Кірылам Вераб'ём запрэглі яго ў брычку, і сам Кірыла сеў за фурмана.

— Ого! — прамовіў Павел, зачыняючы топку. — Можа да ўрадніка пакацілі?

— От таму я і прыйшоў сказаць пра гэта. Калі што не ў парадку, хлопцы, то трэба падрыхтавацца.

— Усё ў парадку, Платон,— задумліва адказаў Станіслаў. — Па-мойму, да ўрадніка пакуль што ў Гендарсана справы няма. Тут нешта іншае. А што за госць у аконама?

— Нейкі панок. Не такі круглы, як Гендарсан, але гладкі. І вельмі вясёлыя абодва.

— Гэта справа горшая, — зазначыў Станіслаў. — Сёння Гендарсану радавацца няма чаго. Скарэй за ўсё яму трэба плакаць. Можа ён п'яны.

— Не без таго. Але вясёлы ён не ад гарэлкі. Такога здаволенага я дасюль яго не бачыў. Увесь аж свіцціцца.

— Гэта ўжо зусім незразумела, —сказаў Станіслаў. — Што ж, будзем гатовы да ўсяго. Пабачым, што за гасцінец ён нам прывязе. Трэба пільнаваць, калі вернецца. Ты, Платон, робіш на дварэ, то наглядай. Можа і сапраўды прывязе сюды ўрадніка.

— Я не прапушчу, — адказаў Платон. Гендарсан са сваім госцем вярнуліся дамоў пад вечар. Калі Кірыла Верабей завёў каня ў стайню і вярнуўся ў старожку, яго ўжо чакаў Платон Шабуня.

— Ну, дзядзька, добра пракаціліся на стаенніку? — запытаў ён.

Стары Верабей зморшчыўся.

— Няхай ён здохне, рукі паадрываў. Не ў мае гады фурманам быць. Да самага Старочына, нібы чорт яго нёс, нідзе не спыніўся, нават на пяску, што пад мястэчкам.

— А куды ж гэта ездзілі паны?

— На пошту, каб яны падушыліся. Як зайшлі абодва, дык нібы расталі, доўга там сядзелі. Што яны там рабілі, не ведаю. Я ж каля жарабца круціўся, пільнаваў чорта, каб ён выдах. Не хоча стаяць, зямлю капытамі б'е... А гэты другі, што з нашым ездзіў, таксама немец. Усю дарогу па-свойму гергеталі, хіба я ведаю па што? Гергеталі і смяяліся, асабліва наш. Да таго развесяліўся — растаць гатовы. А другі той — зубны доктар са Слуцка, бо пытаў у мяне: «Ці маеш зубы, стары?» — «Не, — кажу, — не маю. Паны ўсе павыбівалі». Рагоча, свалата. «Прыязджай,— кажа, — да мяне ў Слуцк, я табе сківіцы ўстаўлю, толькі золата прывозь». От і ўсё, Платон.

Так Шабуня нічога і не ўведаў ад Кірылы Вераб'я.

Загадка разгадалася вечарам. Павел Квітун ішоў да Станіслава Вярбіцкага. На дварэ падмаражвала. Ісці было слізка і няроўна. Павел сышоў з дарогі і ішоў з боку, каля плота, які аддзяляў панскі сад ад двара. Раптам упередзе ён убачыў жаночую постаць, якая рухалася насустрач яму. Спачатку Паўлу здалося, што гэта Надзя. Мабыць, так бывае з кожным закаханым, якому ўсюды мроіцца каханая дзяўчына: кожная жаночая постаць нагадвае яе. Але ў тое ж самае імгненне ён зразумеў, што гэта не Надзя. Што магла рабіць тут Надзя ў такую пару!

— Гэта вы, Павел? — пачуў ён голас і пазнаў Эльзу Гендарсан.

— Я, паненка, — адказаў ён. — Добры вечар.

— Мне трэба было сёння пабачыць вас, Павел, — прамовіла дзяўчына, не адказаўшы на прывітанне.

Такое паведамленне непрыемна ўразіла Паўла, але ён ветліва адказаў:

— Мабыць, тут не вельмі ўдалае месца для сустрэчы, паненка.

— Зусім няўдалае. Мы зойдзем у сад.

Яна пайшла наперад, адчыніла варотцы і павяла Паўла па асенняму саду, які ўжо атрос са сваіх галін усё лісце. Цяпер гэтае лісце, кранутае марозам, шуршала і скрыпела пад нагамі. Дрэвы стаялі голыя, як дзеркачы; праз іх рэдкае галлё відněліся бліскучыя зоркі на халодным начным небе. Усё навокал было зімовае, золкае, але па-свойму прыгожае і крыху патаемнае. Не хапала толькі снегу. «Спатканне... — думаў Павел, — цікавае спатканне ў панскім садзе з панскай дачкой...»

Эльза спынілася каля старой грушы, трухлявай і дуплянастай. Адсюль відны былі ярка асветленыя вокны аконамавага флігеля. Святло з іх шырокімі палосамі лажылася на мерзлую зямлю, укрытую інеем. Паўла ахапіў нейкі дзіўны настрой, бо ўсё гэта не было падобна на яву.

— Я хачу вас папярэдзіць, Павел, — сказала Эльза, хутаючыся ў вялізную ваўняную хустку, якая рабіла яе падобнай на пажылую жанчыну, кволую і бездапаможную.

— Я хачу вас папярэдзіць, што Якаў Шэмет не будзе працаваць у маёнтку.

— А якая мая справа да Якава Шэмета? — абыякава адказаў Павел, хоць усё навакольнае ў яго вачах страціла свой казачны выгляд.

— Не гаварыце мне гэтага, Павел. Я ведаю ўсё. Тата расказаў. Яны п'юць з зубным урачом са Слуцка, і тата расказаў усё, пра што вы гаварылі сёння ў броварны, калі спынілася машына ў млыне. Сёння яны ездзілі ў Старочын і адбілі тэлеграму ў Рыгу да брата гэтага зубнога ўрача. Ён скора прыедзе сюды і будзе старшым механікам. Я не ведаю, што там за брат, мабыць, добры прахвост, бо ў Рызе яму няма месца... Я павінна была папярэдзіць вас, Павел...

— Для мяне гэта ўсё роўна, паненка. Мае пасады брат зубнога ўрача не зойме. Я не механік.

Гэта былі словы, а душу Паўла заліла гарачая хваля ўдзячнасці і прыязнага пачуцця да гэтай незразумелай чужой дзяўчыны.

— Не, вам не ўсё роўна, Павел. Гэта мне ўсё роўна, аднак я папярэдзіла вас... Бывайце, Павел...

Яна падала яму руку. Ён узяў у сваю гарачую далонь яе халодныя трапяткія пальчыкі і па-сяброўску паціснуў іх. І яна пайшла да флігеля, ахінуўшыся вялізнай ваўнянай хусткай, як пажылая жанчына... Павел глядзеў ёй услед аж датуль, пакуль постаць не схавалася за сцяной дома.

# У НАШЫХ СЯБРОЎ

### «ЛЕНІН У ЖЫЦЦІ»

З прычыны 50-годдзя знаходжання Леніна ў Польшчы выдавецтва «Іскры» падрыхтавала фотаальбом «Ленін у жыцці».

У альбом уключаны шматлікія фатаграфіі Леніна, яго блізкіх, сяброў. Многія здымкі публікуюцца ў Польшчы ўпершыню.

### УЗНАГАРОДЖАННЕ САВЕЦКАГА ЖУРНАЛІСТА

Восем год выходзіць у Польшчы штотыднёвы часопіс «Край раду», на старонках якога публікуюцца паведамленні аб жыцці і дасягненнях народаў Савецкага Саюза. Нязменным галоўным рэдактарам штотыднёвіка быў Барыс Жырноў, які нядаўна пакінуў Польшчу.

Дзяржаўны Савет ПНР узнагародзіў В. Жырнова за заслугі ў справе ўмацавання польска-савецкай дружбы афіцэрскім Крыжам ордэна Адраджэння Польшчы.

### ПАСЛЯ ГАСТРОЛЯЎ У СССР

З гастрольнай паездкі па Савецкім Саюзе вярнулася варшаўская аперэта, якая дала 17 спектакляў у Маскве, Каунасе, Вільнюсе.

«Савецкаму гледачу больш за ўсё спадабалася аперэта «Параход «Русалка», — сказаў дырэктар тэатра Т. Бурштыновіч, а тэатральным крытыкам — «Парыжскае жыццё» Афенбаха. Усюды мы сустракалі цёплы прыём. Крытыка адзначала, што наш тэатр здолеў выпрацаваць уласны арыгінальны стыль».

Расказваючы пра свае ўражанні, вядучая артыстка варшаўскай аперэты і адначасова рэжысёр «Парахода «Русалка» Беата Арцемская сказала:

«У мяне захавалася вельмі прыемныя ўспаміны аб паездцы. Асабліва важнымі былі для мяне дзве падзеі: гарачы прыём маскоўскай публікай «Парахода «Русалка» і наведанне аднаго з нашых спектакляў Мікітам Сяргеевічам Хрушчовым і яго сям'ёй».

### ЭКСПАРТ ПОЛЬСКІХ ФІЛЬМАЎ

Польская кінематаграфія заваёўвае ўсё больш трывалае месца на сусветным рынку. Па дадзеных Галоўнага ўпраўлення па справах кінематаграфіі, у мінулым годзе былі прададзены за граніцу 164 кінафільмы, г. зн. на 94 больш, чым было намечана, а сярод контрагентаў з'явілася 14 новых краін.

Гістарычны фільм у дзвюх серыях «Крыжаносцы» А. Форда быў закуплены 22 краінамі. Сур'ёзнае месца ў экспарце займае таксама фільм Е. Кавалярovіча «Маці Іаанна ад анёлаў», куплены 10 краінамі.

Прыбыткі ад экспарту польскіх фільмаў склалі ў мінулым годзе 4.921 тыс. валютных злотых.

### КАНГРЭС НАВУКОВАГА ФІЛЬМА

23—30 верасня ў Варшаве адбудзецца кангрэс Асацыяцыі навуковага фільма (АІКС) з удзелам дэлегацый 40 краін.

Асацыяцыя была створана ў 1946 г. па ініцыятыве кінаработнікаў Польшчы, Францыі і Англіі. Цяпер яна аб'ядноўвае 30 краін. Штогод колькасць членаў Асацыяцыі папаўняецца.

З выпадку кангрэса ў Варшаве адбудзецца таксама Міжнародны фестываль навуковага фільма.

### ЭКРАНІЗАЦЫЯ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ

Хутка будуць распачаты здымкі некалькіх мастацкіх фільмаў, якія з'яўляюцца экранізацыяй вядомых мастацкіх твораў, у тым ліку: «Як быць каханай» Казімежа Брандыса, «Прайшоўшыя праз агонь» Войцэха Жукроўскага, «Загончык» Рамана Братнага, «Пунсовая ружа» Марыі Кругер, а таксама «Дзённік Ганкі» Даленгі-Мастовіча.

### НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ МАЗОВІІ

У сувязі з «Годам Мазавецкай зямлі», які цяпер адзначаецца, у Варшаве адкрыта выстаўка народнай творчасці Мазовіі, якая славіцца старадаўнімі песнямі, танцамі, фальклорам, жывапісам, скульптурай і мастацкімі тканінамі. За мінулыя 17 год у Мазовіі былі арганізаваны 21 конкурс і выстаўка народнага мастацтва, якія прапагандавалі выдатныя традыцыі народнай творчасці.

### КШЫЖЭЎСКАЯ І ЦЫБУЛЬСКІ У НОВЫМ ФІЛЬМЕ

Папулярныя кінаакцёры Эва Кшыжэўская і Збігнеў Цыбульскі — герої фільма А. Вайды «Попел і алмаз» зноў выступяць разам у новым польскім кінафільме «Злачынца і дзяўчына» па сцэнарыі польскага пісьменніка Джо Алекса.

### ГРУНВАЛЬДСКІ МУЗЕЙ

15 ліпеня, у 552 гадавіну бітвы з крыжаносцамі на Грунвальдскім полі, быў адкрыты музей, у якім сабраны экспанаты, звязаныя з гістарычнай бітвай, рэчы, знойдзеныя ў час археалагічных раскопак, якія адносяцца да 1409 — 1411 гг.

З бюлетэня «Польскі агляд».

«СВАБОДНЫ СВЕТ» БЕЗ ГРЫМУ

# ЖЫЦЦЁ Ў КРЭДЫТ

Яркая, рэзкая рэклама кліча, перакоквае, моліць: «Купляйце ў крэдыт! Бязадкладная дастаўка. Плацяжы пачынаючы з 1963 года». «Лёгкія ўмовы: купляйце цяпер, плаціць будзеце пазней».

І амерыканец купляе. Купляе мэблю, халадзільнік, аўтамабіль... А аднойчы, раніцай, атрымаўшы рахункі розных магазінаў і фінансавых кампаній, даведваецца, што яму трэба штомесячна плаціць: 78 долараў за аўтамашыну, 44 долары за тэлевізар, 50 долараў за мэблю, 93 долары за домік, 12 долараў за гадзіннік, 11 долараў за цацкі для дзяцей. Так адбылося аднойчы са сціплым клеркам у горадзе Атланта. Калі ён зразумеў, што ад яго зарплаты не застаецца нават на хлеб надзённы, ён проста знік—уцёк, куды вочы глядзяць.

Вядома, у клерка быў другі выхад—ён мог абвясціць сябе банкротам. Так зрабілі летась 131 тысяча амерыканцаў. Пры гэтым яны пазбавіліся ўсёй сваёй маёмасці, купленай як у крэдыт, так і за наяўныя. На дзіўна, што ўсё больш амерыканцаў пачынаюць усведамляць, што так званы спажывецкі крэдыт—гэта адна з лоўкіх форм абрабавання пакупнікоў. Пры гэтым кампаніі не толькі збываюць свае тавары, але і бяруць вялізарныя працэнты «за растэрмінкоўку».

Зразумеў гэта і Роберт Кілмар. У канцы 1956 года ён дэмабілізаваўся з наёмнага корпуса марской пяхоты. Служба ў гэтых прывілеяваных войсках, якія выконваюць паліцэйскія функцыі ў розных частках свету, мае пэўныя перавагі: яна добра аплачваецца. Сышоўшы на бераг у роднай краіне, Кілмар прыдбаў новенькі «форд», паступіў на работу ў тэлефонную кампанію і, урэшце, ажаніўся.

Стаўрэнне сям'і немінуча вядзе да павелічэння выдаткаў. Каб набыць самыя неабходныя прадметы для вядзення хатняй гаспадаркі, Кілмар узяў у доўг у фінансавай кампаніі 200 долараў. Атрымаўшы павестку на ўплату першага ўзносу, ён вывеў, што яму трэба будзе вярнуць кампаніі разам з працэнтамі каля 400 долараў. Да таго часу ён пазычыў яшчэ 400 долараў на мэблю. Неўзабаве яму давялося пазычыць яшчэ 500 долараў для аплаты ранейшых даўгоў і працэнтаў на іх.

Цяпер з тыднёвага заработку ў 131 долар ён прыносіць дамоў усяго 15 долараў. Кілмар прымушан быў прадаць аўтамабіль і падшукаць дадатковую работу. Скончыўшы працоўны дзень у тэлефоннай кампаніі, ён накіроўваецца ў кінатэатр, дзе служыць памочнікам адміністратара. І так кожны дзень, з раніцы да позняй ночы. Наперадзе незайздросная перспектыва: банкруцтва і, напэўна, распад сям'і...

Дзесяткі мільёнаў амерыканцаў жывуць у доўг. Згодна афіцыйных падлікаў, да канца 1961 года амерыканскія пакупнікі задаўжалі фінансавым гандлёвым кампаніям 290 мільярдаў долараў. «Спажывецкі доўг не толькі дасягае вялізарнай лічбы — ён хутка павялічваецца», — з трывогай пісаў буржуазны часопіс «Ньюсуік». Набыццё рэчаў у крэдыт стала ў ЗША нацыянальнай хваробаю, «дарагім наркотыкам», па выразу таго ж часопіса. Гэты наркотык, ствараючы ўражанне матэрыяльнага дабрабыту, а часам нават камфорту, непазбежна вядзе да разарэння, росту злачынства, самагубстваў.

Дорага каштуе амерыканцам «спажывецкі крэдыт».

**В. КАЧАНАЎ.**
(АДН).

# Зроблена кінааматарамі

Трэці год у Крычаве існуе аматарская кінастудыя. У ёй працуюць рабочы цэментна-шыфернага камбіната Пастушэнка, мясцовыя журналісты Карамазаў, Прахарэнка, Шчарбакоў і інш. Не раз кінастудыя радавала гледачоў цікавымі самадзейнымі фільмамі з жыцця калгасаў, прадпрыемстваў і будоўляў раёна. Зараз на экраны выпушчана новая работа кінааматараў пра ўдарную будоўлю сямігодкі — Крычаўскі цэментна-шыферны камбінат. Гледачы ўбачаць заслужанага будаўніка рэспублікі І. Колычава, рабочага-карэспандэнта В. Мацвеенку, славутую брыгаду мантажнікаў Пятра Навіцкага.

Будаўнікі і эксплуатацыйнікі камбіната з цікавасцю сустрэлі новую работу аматараў.

І. ЧАРНЯК.

**Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.**
**Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА.**

**«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск**

**Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры—3-22-04, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03**

**«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу**

АТ 08597

**Друкарня выдавецтва «Звязда».**